Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АББЕСТКІ: За радок шпальтовага тэксту — р. 50 к. За радок шпальтовага тэксту 1 р. — к. За радок шпальтовага поперак тэксту 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. кошту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 • Беспраўн. і чырвонаармейцы за радок . . 15 • За кожны дадатковы . . 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АББЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ЕЬДАНЬНЯ. ШТ ДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 7 (2496 Чацьвер, 10-га студзеня 1929 г.

Катэгарычны загад.

«Правда» ў дзеньніку пад загалоўкам «Категорический приказ» піша:

У Чэрвені 1927 году была абвешчана пастанова ЦВК СССР «аб зацьверджаньні палажэньня наконт дзяржаўных прамысловых трэстаў», згодна якое дырэктарам выдаецца даверанасьць і надаецца права самастойных рахункаводствам калькуляцыі, складаньня балянсу, апэрацый у галіне дастаўкі і г. д.

Здавалася-б цяпер ужо пакончана з апошнімі рэшткамі хвасьцізму ў індустрыі. Аднак, гэта зусім ня так. Праўленьні трэстаў паклалі гэтую пастанову пад сукно і фабрык сваіх на гаспадарчы разрахунак не пераводзілі. Гэта было на працягу 1928 году адзначана РСІ, а цяпер у агалошаным учора загадзе № 301 па ВСНГ СССР адзначаецца, што «наладжанае галоўнай інспекцыяй абсьледаваньне саюзных трэстаў і прадпрыёмстваў выявіла вельмі марудное ажыцьцяўленьне загадаў аб пераводзе прадпрыёмстваў на гаспадарчы разрахунак». Гэты пераход быў выканаць сваячасна толькі адным трэстам. Безумоўна, палкам апраўдае сябе той тон прэзыдыуму ВСНГ СССР, які загадзе «неадкладна скончыць поўнасьцю пераход прадпрыёмстваў на гаспадарчы разрахунак у поўнай адпаведнасьці з загадамі»...

Кіруючыя працаўнікі праўленьняў трэстаў павінны спыніць валакіту, якая мяжуецца часам проста з сабатажам, валакіту ў адносінах перабудовы ўзаемадачыненьняў між дырэктарамі заводаў і праўленьнямі трэстаў. Дырэктары-ж павінны энэргічна дамагацца ажыцьцяўленьня існуючых урадавых загадаў у гэтым пытаньні. Партыйныя арганізацыі павінны прасачыць, ці выконваюцца адпаведныя загады.

Новы крок у культурным зблiжэньні Нямеччыны і СССР.

У МАСКВЕ ПАЧАЎСЯ „ТЫДЗЕНЬ НЯМЕЦКАЕ ТЭХНІКІ".

ТЫДЗЕНЬ ПАВІНЕН ПАСПРЫЯЦЬ СКАРЫСТАНЬНЮ НЯМЕЦКІХ ТЭХНІЧНЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ У НАШАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

МАСКВА. 8-га студзеня ўвечары ў Калонным залі першага Маскоўскага Дзяржаўнага Унівэрсытэту адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае „тыдню нямецкае тэхнікі".

Пасяджэньне адчынілася прамовай Стаманякова. Ён зазначае, што Нямеччына, заняўшы сярод іншых краёў першае месца ў тавараабмене з СССР, займае таксама першае месца ў абмене культурнымі каштоўнасьцямі з нашым краем. Савецкая дзяржава і савецкая грамадзкасьць з аблегчэньнем заўважылі поранець з Нямеччыны вынікі працы ва ўсіх галінах навукі, якія маюць рашаючае значэньне для індустрыялізацыі і перабудовы сельскае гаспадаркі. З гэтае прычыны таварыства «Культура і Тэхніка» і прысьвяціла сваё першае вялікае пачынаньне ў галіне азнаямленьня нашае грамадзкасьці з самымі новымі дасягненьнямі нямецкае навукі наладжаньнем „тыдню нямецкае тэхнікі". Саюз нямецкіх інжынэраў узяўся разам з намі за наладжаньне «тыдню нямецкае тэхнікі», за гэта мы выказваем яму нашую ўдзячнасьць. Шмат буйных прадстаўнікоў нямецкае навукі і тэхнікі адгукнуліся на наш заклік. У іх асобе мы вітаем нямецкую навуку і тэхніку. Я ўпэўнен, што іх прыезд да нас будзе спрыяць росту ўзаемнага разуменьня між нашымі краінамі.

Далей Стаманякоў зачытвае ліст старшыні СНК СССР Рыкава. „Тыдзень нямецкае тэхнікі",—зазначана ў лісьце,—павінен заняць належнае месца ў разьвіцьці культурных і навукова-тэхнічных дачыненьняў між СССР і Нямеччынаю. «Тыдзень» адпавядае вялікім патрэбам нашага краю ў павялічэньні ўзроўню нашае тэхнікі і індустрыялізацыі краю на новай тэхнічнай базе. У зьвязку з гэтым я рад вітаць арганізатараў і ўдзельнікаў „тыдню нямецкае тэхнікі" і выказваю пажаданьне, каб савецкія вучоныя, тэхнікі і гаспадарцы набылі як мага больш карысьці для нашае навукі, тэхнікі і сацыялістычнага будаўніцтва СССР».

Нямецкі пасол Дырксэн у сваёй прамове між іншым сказаў: «Мне здаецца, што сярод розных галін супольнае дзейнасьці, якая ўжо на працягу гадоў існуе між Нямеччынаю і Савецкім Саюзам, супольная дзейнасьць на ніве тэхнікі дала самыя яскравыя вынікі і самую вялікую карысьць абодвым народам. Разьвіцьцё Савецкага Саюзу адбываецца зараз пад лёзунгам шырокае індустрыялізацыі. Я карыстаюся выпадкам, каб адхіліць погляд, што ў Нямеччыне нібыта ёсьць упливовыя колы, якія з варожасьцю сочаць за індустрыялізацыяй Савецкага Саюзу. Сучаснае і мінулае паказалі в належнаю пераконанасьцю, што справа стаіць якраз наадварот. Той факт, што саюз нямецкіх інжынэраў з ахвотаю адгукнуўся на прапанову таварыства «Культура і Тэхніка» супольна наладзіць «тыдзень», выразна падкрэсьлівае гатоўнасьць нямецкага тэхнічнага сьвету дзяліцца з Савецкім Саюзам вынікамі сваіх тэаретычных ведаў і практычным вопытам і адначасна карыстацца вынікамі дасягненьняў савецкае навукі».

Старшыня ВСНГ СССР т. Куйбышаў у сваёй прамове зазначае, што мы вельмі ўважліва адносімся да ўсіх форм міжнароднага супрацоўніцтва вучоных і тэхнікаў і шчыра вітаем, у асобе нямецкіх гасьцей, лепшых прадстаўнікоў нямецкае навукі і тэхнікі.

З прывітальнымі выступіні яшчэ тт. Луначарскі,Ржыжаноўскі, акадэмік Лазараў, Каменеў і інш.

З прамовамі ў адказ выступаюць прадстаўнікі нямецкае вучонае делегацыі прафэсары Камуллер і Матчос. Камуллер у цёплай прамове выказвае ўдзячнасьць за запросіны яго для ўдзелу ў «тыдні нямецкае тэхнікі». Ён толькі-што прыехаў, але ўжо ведае, што ў СССР нарадзілася шмат новых буйных электрастанцый, і справа электрыфікацыі шпаркімі крокамі ідзе наперад. Матчос гаворыць аб тай гасьцінасьці, якую нямецкія вучоныя спаткалі ў СССР, і запрашае савецкіх інжынэраў на бліжэйшы зьезд нямецкіх інжынэраў у Кенігсбэрзе.

Увечары ў т. Стаманякова адбыўся прыём у часьць нямецкіх гасьцей.

Дэлегацыя нямецкіх вучоных на „тыдні".

МАСКВА 8-га студзеня а 2-й гадз дню прыехалі ў Маскву нямецкія вучоныя, удзельнікі «тыдню нямецкае тэхнікі». Усяго ў Маскву прыехала 11 удзельнікаў „тыдню". На вакзале нямецкія вучоныя былі спатканы сябрамі таварыства „Культура і тэхніка" на чале з старшынёю таварыства т. Стамянковым. Сустракалі нямецкіх вучоных таксама прадстаўнікі нямецкага пасольства і розных грамадзкіх і навуковых арганізацый.

Пасол фон-Дырксэн у т. Калініна

МАСКВА, 8-1. Калінін прыняў новага значачага нямецкага посла Дырксэна, які перадаў яму вярыцельныя граматы. Калінін і пасол абмяняліся прамовамі. У сваёй прамове пасол, між іншым, заявіў: «Мае імкненьне—пакласьці ўсе сілы, каб выканаць усе агульныя задачы ў тым духу, які даў натхненьне майму папярэднику на гэтай пасадзе, набожчыку Брандорф-Ранцау.

У адказной прамове Калінін, між іншым сказаў: «Прашу вас прыняць заверэньне ў тым, што ў выкананьні ўскладзенае на вас абязанае і высокае місіі вы незьменна сустрэнеце маё поўнае давер'е і падтрыманьне, таксама як і ўзаемную дапамогу з боку Ураду СССР».

Заява фон-Дырксэна супрацоўніку ТАСС.

МАСКВА, 8-1. 8-га студзеня нямецкі пасол Гербэрт фон-Дырксэн прыняў супрацоўніка ТАСС, у гутарцы з якім заявіў наступнае: «Мэта мая далей паглыбляць прыяцельскія дачыненьні між Нямеччынаю і СССР на карысьць абодвых нашых народаў. „Тыдзень нямецкае тэхнікі", які сёньня адчыняецца ў Маскве, я разглядаю, як шчасьлівы пачатак мае тутэйшае дзейнасьці. Адзін з галоўных шляхоў мірнага і карыснага супрацоўніцтва між нямецкім народам і народамі Савецкага Саюзу, на мой погляд, у тым, каб культывіраваць і разгортваць нашыя дачыненьні ў культурнай і навуковай галінах".

Адказваючы далей на запытаньне аб перспэктывах савецка-нямецкіх эканамічных дачыненьняў, пасол адзначыў, што асновай эканамічных дачыненьняў між Нямеччынай і СССР служыць савецка-нямецкі гандлёвы ўгавор 1925 г. Аб тых пытаньнях, якія заставаліся на зуоім выразнасьці, адбываліся перамовы, і падпісаны 21-га сьнежня 1928 г. пратакол зусім здавальняюча адказвае на пытаньні, якія зьяўляліся тэмаю перамоў. «У нямецкіх колах пратакол спатканы з вялікім задаволеньнем, і я вельмі рад, што і ў савецкіх колах віталі падпісаньне гэтага пратаколу».

Пуанкарэ чакае адстаўка.

ПАРЫЖ, 8-1. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Сёньня адчынілася сэсія парляманту. Старшынёю палаты пераабраны Буісон, які атрымаў 414 галасоў з 500. Група радыкал-сацыялістаў будзе галасаваць проці вотуму давер'я ўраду.

Польшча тужыцца сарваць прапанову СССР.

ПОЛЬСКІЯ „АГАВОРКІ", ЯКІЯ ЗАЦЯГНУЦЬ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ПРАПАНОВЫ НА ДОЎГІ ЧАС.

ПОЛЬСКІ АДКАЗ УЖО НАРЫХТАВАНЫ.

ВАРШАВА, 8-1. У польскім міністэрстве замежных спраў зараз адбываюцца нарады наконт канчатковага польскага адказу на ноту Літвінава. «Газэта Варшавска" паведамляе, што ў зьвязку з прыездам у Варшаву Патэка польскі адказ крыху затрымаецца.

У процівагу гэтаму афіцыёзная „Глос Правды" паведамляе, што нота Польшчы будзе паслана ў Маскву сёньня ўвечары або на працягу заўтрашняга дня. У заўвазе да гэтага паведамленьня „Глос Правды" заяўляе: „хоць канчатковая рэдакцыя ноты яшчэ не ўстаноўлена, але можна ўжо зараз сказаць, што нота ня будзе зьмяшчаць адмовы ад савецкае прапановы. Трэба, аднак, памятаць, што Польшча зьяўляецца толькі аднэю з 14 ці дзяржаў, якія падпісалі пакт Келега. З далікатнасьці польскі ўрад, як відаць захоча, каб тэкстст прапанаванага яму пратаколу абмеркавалі і іншыя 13 дзяржаў—удзельнікаў пакту.

Нэрвовасьць польскіх газэт

ВАРШАВА. 8-1. Адначасна з вельмі нэрвовым артыкулам афіцыёзу «Эпока», у кракаўскім «Часе» зьмешчана ня менш вострая ацэнка артыкулу «Известий» аб водгуках польскага друку на ноту т. Літвінава. «Час» бачыць у артыкуле «Известий» нейкі «ультыматум» і заяўляе: «Саветы загадзя адхіляюць усе ўмовы, якія могуць быць прапанаваны Польшчаю. Але што будзе, калі польскі ўрад усё такі запрапануе свае ўмовы, або зробіць якія-небудзь агаворкі? Ці будзе гэта азначаць «casus b ili» (прычынка для вайны)? Падпісаньне спэцыяльнага ўгавору, які прапанаваны Літвінавым, уцягнула-б Польшчу ў кола савецкага ўплыву і вельмі перашкодзіла-б яе барацьбе з бальшавіцкаю прапагандаю».

У Польшчы выбіты ўсе „козыры".

БЭРЛІН, 8-1. Наконт ноты Літвінава да Польшчы орган цэнтру «Нямеччына» піша: «На трэба сумнявацца, што Расея ў сучасны момант настроена значна больш мірна, чымся Польшча. Згода Літвы на савецкую прапанову ачыняе шлях да згоды між Польшчаю і Літвою, за ўсякім разе, з боку Літвы. Калі Польшча адхіліць савецкую прапанову, дык гэта надасьць яе замежна-палітычным адносінам яшчэ больш цяжкае становішча, бо яна дасюль у дказ на ўсе пажаданьні разброеньня зазначала на нібыта пагражаючую яе межам савецкую дзяржаву».

«Кельніше Цэйтунг» востра крытыкуе пазіцыю польскага афіцыёзу «Эпока», які спрабуе завіраць, нібыта ў савецкай прапанове «прыкметна роля Бэрліну». «Кельніше Цэйтунг» ставіць запытаньне: «Чаго-ж, уласна кажучы, жадае Польшча? Упачатку яна патрабуе ўсюды, дзе толькі можна, мірных гарантый; калі-ж ёй прапануюць гэтыя гарантыі, дык яна ва ўсім пачынае бачыць варожыя намеры. Прапанаваны Літвінавым пратакол ва ўсякім разе меў тое значэньне, што зрабіў беспадстаўнымі ўсе скаргі Польшчы».

Рабочыя Польшчы вітаюць ноту Літвінава.

КІЕЎ, 8 1. Рабочыя трамвайных майстэрняў імя Домбаля атрымалі ад польскіх рабочых гораду Львову ліст, у якім, між іншым, зазначана: «Мы з радасьцю прачыталі зварот савецкага ўраду да ўраду Польшчы наконт міру. У гэтыя дні мы ня можам забыць, што першым урадам, які падпісаў славутую адозву (за подпісам т. Леніна) аб спыненьні вайны, быў урад рабочых і сялян СССР. Мы пераканаліся, што СССР змагаецца шчыра за мір і далучаем свой голос да голасу працоўных СССР аб міру. Бяда таму, хто адважыцца ўзьняць руку проці СССР—вернага вартаўніка міру".

НОВАЯ „МІРНАЯ" ЗАЯВА ЗАЛЕСКАГА.

ВАРШАВА, 8-1. Польскі друк вымяшчае сёньня гутарку, якую, як выявілася, меў Залескі яшчэ ў Лугано з прадстаўніком агенцтва «Англа-Амэрыкен Нью-Сюпэр Сэрвіс».

«Польшча ня мае ніякіх пратэзій на чужыя землі, — сказаў Залескі. Чуткі, нібыта Польшча рыхтуецца ўзяць на сябе ролю авангарду проці саветаў, памылковыя. Польшча імкнецца пашырыць гаспадарчыя зносіны з СССР. Калі да гэтага часу між Польшчаю і СССР не падпісан гандлёвы ўгавор, дык галоўная перашкода толькі ў савецкай сыстэме манаполіі замежнага гандлю».

Наконт пытаньня аб Данцыгскім карыдоры Залескі сказаў: «Довад за далучэньне карыдору да Нямеччыны дзеля заснаваньня непасрэдных зносін з Усходняй Прусіяй ня шчыры. 30 цімільённы народ мае большае права на выхад да мора, чымся 2 з паловаю мільёны жыхарства Усходняе Прусіі, якія жадаюць мець непасрэдную сувязь з Нямеччынаю. Становішча нямецкае меншасьці ў Польшчы вельмі добрае і ніводная меншасьць ня мае такіх прывілей і правоў, як нямецкая. Не зважаючы на гэта, нямецкая меншасьць выяўляе заўсёды сваё незадаволеньне».

НЯМЕЦКАЯ ПРЭСА АБУРАНА...

БЭРЛІН, 8-1. Заява Залескага аб Данцыгскім карыдоры, а таксама аб нацыянальных меншасьцях, выклікае у нямецкіх палітычных колах востры адпор. «Дэйтшэ Альгемэйне Цэйтунг» піша: «Залескі дае фантастычны малюнак, які можа выклікаць толькі ўхмылку спачуваньня наконт наіўнасьці кіраўніка польскае замежнае палітыкі».

У Саюзных Рэспубліках

Ход перавыбараў у Сібіру.

(Заява т. Луначарскага).

МАСКВА, 8-1. Вярнуўся з Сібіру Наркам Асьветы РСФСР т. Луначарскі. А. В. Луначарскі выступіў у розных акругах краю на рабочых і сялянскіх сходах са справаздачаю аб працы ўраду.

У гутарцы з супрацоўнікам Роста т. Луначарскі паведаміў, што яму прышлося выступаць са справаздачаю ўраду на шматлюдных сходах у гарадох і вёсках. У некаторых вёскіх сходы ад 5 6 гадзін увечары цягнуліся да гадзіны ўначы. Прысутныя на сходах выказвалі ўраду падзяку за тое, што справаздачы робяць непасрэдна члены ўраду, і выказвалі пажаданьні, каб такія справаздачы рабіліся больш рэгулярна. Агульнае ражаньне аб вёсны Сібіры добра ведае аб спробах кулакоў і ведае, што ім трэба даць адпор. Сераднякі і беднякі адносяцца да калгасаў у асноўным вельмі спрыяюча. У шмат-якіх акругах ужо заснавана шмат калгасаў. Расьце вялікі рух за далейшае разьвіцьцё калгасаў. Бэдрацкая частка вёскі часта выступала з вострымі скаргамі на мясцовыя органы ўлады.

На рабочых сходах уся ўвага згуртоўвалася на пытаньні аб паскораньні тэмпу індустрыялізацыі Сібіру. У рабочых райёнах ідэя ўмацоўненя права на аказваньні дапамогі вёсны у часе выбараў. Актыўную дапамогу сялянству аказваюць чырвонаармейцы, я іх пасылаюць на вёскі сотні лістоў аб надыходзячых выбарах і аб патрэбе барацьбы з кулаком.

На 7-мігадзінны дзень.

БАКУ, 8-1. У 1928-29 годзе намечана да пераводу на 7-мігадзінны працоўны дзень дадаткова 29 прадпрыёмстваў Азнафты. Да канца 1928 29 году будзе пераведзена на 7-мігадзінны працоўны дзень 25 проц агульнага ліку рабочых на прадпрыёмствах Азнафты, г. зн. блізка 10-ці тысяч чалавек.

10 гадоў Нямецкае рэспублікі.

ПАКРОЎСК, 7-1. 6-га студзеня раніцою адбылася вялічэзная дэманстрацыя ў гонар 10-цігодзьдзя аўтаноміі рэспублікі немцаў Паваложжа. Ад імя саюзнага ўраду дэманстрантаў вітаў тав. Мукалевіч. На дэманстрацыю з Саратаву прыехала ў поўным складзе № дывізія супольна з нацыянальным палком «імя Нямрэспублікі». На пляцы адбыўся парад войск з гарматным салютам у гонар 10-цігодзьдзя аўтаноміі. Увечары дармова дэманстраваўся фільм з жыцьця немцаў Паваложжа. Горад быў сьвяточна ўпрыгожан. Пасланы прывітаньні ЦК УсеКП(б), ураду РСФСР і нямецкай кампартыі.

10 год Існаваньня ЦАГІ

МАСКВА. У Вялікім Тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 10-м угодкам існаваньня цэнтральнага аэрагідрадынамічнага Інстытуту (ЦАГІ). Сябра прэзыдыуму ТДА-Авіяхіму СССР т. Эйдэман, які старшынстываў на пасяджэньні, у кароткім уступным слове прывітаў ЦАГІ, яго навуковых працаўнікоў і канструктараў. Дырэктар і старшыня ЦАГІ прафэсар Чаплыгін, спатканы гучнымі воплескамі працаўнікоў ЦАГІ і рабочых авіязыйных заводаў, прысутных у залі, сказаў цёплую шчырую прамову, прысьвечаную памяці заснавальніка Інстытуту прафэсара Жукоўскага.

Ад імя прэзыдыуму ВСНГ вітаў ЦАГІ т. Талаковцаў, ад Акадэміі Навук—акадэмік Лазараў, ад Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР—т. Посьнікаў, ад Масавіяту і МК УсеКП(б) т. Лаўроў і інш

Ад прэзыдыуму ТДА—Авіяхіму СССР т. Ціхаміраў перадаў дырэктару ЦАГІ прафэсару Чаплыгіну ганаровую грамату.

Рабочая опэра.

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНСК, 6-1. У нядзелю тэкстыльшчыкаў адбылося адчыненьне Іванава-Вазьнясенскае рабочае опэры. Акторы ў пераважаючай большасьці—рабочыя і служачыя мясцовых фабрык і ўстаноў.

Першаю пастаўлена опэра «Лакмэ». Выкананьне опэры вызначае вялікае задаволеньне слухачоў

Заснавала опэру мясцовае філярманічнае таварыства. Таварыства мае на мэце прапаганду музыкі ў масах, у процівагу працы цаноўнікаў, якія сваімі хорамі прыцягваюць у царкву нават неверуючых.

Камсамольцы-актывісты на перавыбары ў вёску

МАСКВА. Бюро ЦК УсеЛКСМ прапануе ўсім кіруючым органам саюзу і буйным фабрычна заводзкім ячэйкам узяць непасрэдны ўдзел у перавыбарах саветаў на вёсцы. Камсамольскія арганізацыі павінны паслаць на вёску групы рабочых-актывістаў (пераважна партыйцаў) для ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі. На вёску павінна быць накіравана блізка 10.000 актывістаў.

12 млн. руб. на будаўніцтва гандлёвага флёту

МАСКВА. На апошнім пасяджэньні ўправы савецкага гандлёвага флёту абмяркоўваліся пытаньні капітальнага партовага будаўніцтва. Выдаткі на капітальнае будаўніцтва савецкага гандлёвага флёту за 5 гадоў дасягнуць 12-ці мілёнаў рублёў. Управа савецкага гандлёвага флёту зацьвердзіла плян пабудовы дапаможнага флёту ў ліку 148-мі суднаў рознага тыпу (баржы, буксіры і г. д.). На пабудову гэтых суднаў асыгнавана больш 5,7 млн. руб. Заказы на суды будуць перададзены заводам імя Марты ў Алэсе, таганрогскім майстэрням, Стальзаводу, заводу „Чырвоная Кузьня" і інш.

Крэдытаваньне рабочых для лекаў на курортах.

МАСКВА, 5 1. Між НК Аховы Здароўя і РСФСР і УЦСПС падпісана згода аб палёгачным забраніраваньні за рабочымі курортных месц у 1929 годзе. Па загад прафарганізацый пераходзіць 40 проц. усіх курортных месц, каля 20 тысячы курортных ложкаў. Для рабочых і іх сем'яў, якія на іроўваюцца на курорты ў адзіначным парадку, уводзіцца пад паручыцельства адміністрацыі, ці прадпрыёмства крэдытаваньне да шасьці месяцаў. Курортныя бюро абавязваюцца даваць гэтым рабочым і членам іх сем'яў курортныя месцы ў працягу ўсяго сэзону па найбольш палёгчанай расцэнцы. На курортныя месцы, набываемыя індустрыяльнымі прафарганізацыямі, павінна паступаць ня менш 80 процантаў рабочых ад варстату.

Чыстка вясковых партарганізацый.

ВЯТКА, 3-1. У губэрні распачынаецца чыстка вясковых партыйных ячэек. На месцы выяжджаюць праверачныя камісіі. У першую чаргу будзе праверана некалькі асобных валасных партыйных арганізацый, стан якіх зьяўляецца вельмі дрэнным, а пасьля гэтага будзе праведзена поўная чыстка ўсяе вясковае часткі партыйнае арганізацыі.

Абласны камітэт і губКК зьвярнуліся з лістом, у якім растлумачваюць задачы чысткі і заклікаюць да ўдзелу ў ёй беспартыйных парабкоў і беднякоў

Пашырэньне засеваў кенафу.

МАСКВА, 7-1. Эканомнарада РСФСР абмеркавала даклад акцыянэрнага таварыства «Кенар» аб разьвіцьці культуры кенафу ў РСФСР. Да сучаснага моманту ўжо ёсьць практычныя дасягненьні ў галіне вырошчаньня ўласнага насеньня. Прароблена вялікая праца на вывучэньні і расарэнаўны тэхналёгічных працэсаў, зьвязаных з апрацоўкаю кенафу. Цяпер засевы кенафу намячаецца пашырыць па РСФСР у сёлетнім гаспадарчым годзе да 114.500 гектараў; гэтую лічбу Эканомнарада прызнала адпаведнаю патрэбам народнае гаспадаркі рэспублікі.

Югаславія ў дні самаўладзтва.

ПЕРАВАРОТ ЗЬВЯЗАН З ПАДРЫХТОЎКАЮ ЎВАХОДУ ЮГАСЛАВІІ Ў АНТЫСАВЕЦКІ БЛЁК.

ВЕНА, 8-1. Афіцыйныя паведамленьні з Беларуду заваряюць, нібыта выхарства Югаславіі спаткала дыктатуру «з уздымам», і што кароль атрымаў прывітальныя тэлеграмы ад вядомых арганізацый Харваты. Лідары загрэбскае апозіцыі ўсімі спосабамі спрабуюць стварыць настрой на карысьць дыктатуры, называючы складзены каралём габінэт „пазапарляманцкім і пазітральным". З прычыны ўзмацненьня цэнзуры мінімі вестні аб тым, як глядзяць на пераварот масы ж харства, заграніцу не праходзяць. Не зважаючы на маніфэст кара а, у якім абвешчана дыктатура называецца пераходнаю формаю кіраваньня, агалошаныя ў апошнія дні дэкраты сьведчаць, што ўрад дыктатуры рыхтуецца да доўгага існаваньня «Нэйе Вінэр Тагэблят» зьмяшчае з „пазнае" крыніцы, пад якою безумоўна трэба разумець югаславіўскую місію ў Вене, заметку, дзе выразна адзначаецца, што пераварот меў на мэце не задаволіць патрабаваньні каратаў, а ліквідаваць дзяржаўны крызіс „па-за рамкамі існуючае канстытуцыі". З Беларуду афіцыйна паведамляецца, што ранейшы міністр гандлю—лідэр мусульманаў—Спаго і харват Шурмін запрошаны на аўдыенцыю да караля. Як відаць ім будзе зроблена прапанова ўзяць сабе вакантныя партфэлі. Н месьнікам міністра замежных спраў назначан Качафатовіч, які зьвяўляецца даверанаю асобаю прыдворнае камарыльні, і які займаў да гэтага часу пасаду начальніка генэральнага штабу. Урадавым камісарам усяе Харватыі назначан ранейшы загрэбскі прэфэкт, дэмакрат Зрэлец. Агалошан новы дэкрэт, які прадугледжвае заснаваньне новага вярхоўнага суду і абмежоўвае правамоцнасьць закону аб незалежнасьці судзьдзяў.

Аўстрыйскія і вэнгерскія газэты адзначаюць пераварот у Югаславіі вельмі скептычна. «Нэе Фрэйе Прэсэ» адзначае, што «дэмакратыі ў Зуроўе даведзіцца пяпер вельмі дрэнна", і выказвае над ею, што югаславіўская дыктатура будзе чарговаю. «Рот Фана» адзначае новы ўрад, як дыктатуру вялікасэрбскае буржуазіі і адзначае здрадніцтва лідэраў харватаў апозіцыі. Водгук слоў газэты, пераварот трэба ставіць у сувязь з падрыхтоўкаю да ўваходу Югаславіі ў антысавецкі блёк.

Аўганскі мяцеж прыдушан.

ТАШКЕНТ, 8-1. Аўганскія газэты паведамляюць, што ў Джалалабадзе настаў поўны спакой. Мяцежнікі ўчыняюць налёты толькі на аддаленыя пункты. Урадавае войска захапіла перавал Хайр-Хан, дзякуючы чаму частка мяцежнікаў апынулася адрэзанаю ад Кухламану. Лік паўстанцаў вымяшаецца.

Газэта «Аманіяўган» паведамляе, што частка мяцежнікаў у Кухламане зьбіраецца пакінуць райён паўстаньня. Газэта выказвае меркаваньне, што гэтая частка мяцежнікаў абкружана в усіх бакоў з прычыны вахоту ўрадавым войскам шляху да адступленьня.

ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ІНДЫІ НА ВАРЦЕ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ АЎГАНІСТАНУ

ЛЁНДАН, 8-1. У Лягоры (Індыя) адбыўся мітынг сваяраджыстаў (індусскіх нацыяналістаў), які ўхваліў рэзалюцыю з зазначэньнем на „падаўроны і трывожны характар таго факту, што на працягу апошніх гадоў паўстаньні ў Аўганістане адбываліся толькі на ўсходніх межах краю". Далей, рэзалюцыя „перасьцерагае англельскі ўрад ад якога-небудзь дачыненьня да росту непарадкаў на аўганскай мяжы або ад падтрыманьня аўганскіх мяцежнікаў, каб не стварацъ нагрозы для ўсеагульнага спакою".

Удар па правых у нямецкай кампартыі.

БЭРЛІН, 8-1. Пашыранае пасяджэньне Бэрлін-Брандэнбурскага акруговага камітэту большасьцю 107-мі галасоў проці 6-ці пры адным, які ўстрымаўся, ухваліла рэзалюцыю, у якой цалкам згаджаецца з лістом выканкому Камінтэрну і выключэньнем з партыі правых. Рэзалюцыя лічыць патрэбным таксама выключыць з партыі Брандлера і Тальгеймэра.

Акруговы камітэт выключыў з партыі правых Георга Шэдэ, Розі Вольфштэйн і Вальдэмара Бальцэ за фракцыйную працу і шкодную для партыі дзейнасьць.

БЭРЛІН, 3-1. Акруговы камітэт кампартыі Гамбургу і Прыморскае вобласьці ўхваліў рэзалюцыю, у якой заяўляе аб сваёй згодзе з адкрытым лістом выканкому Камінтэрну і спэцыяльна зазначае на энэргічнае падтрыманьне выканкому Камінтэрну пры ўпарадкаваньні ўнутрыпартыйных супярэчнасьцяў у Нямеччыне.

ВЫБАРЧАЯ ПЕРАМОГА КАМПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 8-1. Выбары ў ландтаг у Ліпэ-Дэтмальдзе (Заходняя Нямеччына) далі значны посьпех камуністычнай партыі. Лік галасоў пададзеных за камуністаў, узняўся да 4943-х проці 3.441 у маі 1928 году.

Забаронена дэманстрацыя ля магілы К. Лібкнэхта.

КАМПАРТЫЯ КЛІЧА РАБОЧЫХ ДА ДЭМАНСТРАЦЫІ НАПЕРАКОР ЗАГАДУ МЕНШАВІЦКАЕ ПАЛІЦЫІ.

БЭРЛІН, 8-1. Бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт, сацыял дэмакрат Цэргібель паведаміў акруговы камітэт нямецкае камуністычнае партыі, што загад аб забароне дэманстрацый мае моц таксама ў адносінах да назначанае на нядзелю памінальнае дэманстрацыі бэрлінскага пралетарыяту на магілах Лібкнэхта і Розы Люксэмбург.

Акруговы камітэт камуністычнае партыі агаласіў адозву, у якой заклікае рабочых зьвяціца на масавую дэманстрацыю на магілах ахвяр рэвалюцыі 13-га студзеня, не зважаючы на забарону Цэргібеля.

Фронт штрэйкбрэхераў і паліцыі проці гарнякоў Сэнт-Эцьену.

БАСТУЕ 35000 ГАРНЯКОЎ.

ПАРЫЖ, 8-1. Учора ў шэрагу пунктаў райёну Сэнт-Эцьен (дэпартамант Луары) адбыліся стычкі бастуючых з штрэйкбрэхерамі і паліцыяй. Водлуг вестак «Юманітэ» на рудніках Кро штрэйкбрэхер параніў бастуючага камуніста; у Рыкамэры арыштавана некалькі брыкетчыкаў. У часе стычак з паліцыяй на рудніках Шана некалькі бастуючых паранена ўдарамі гумавых кіёў.

Выканаўчы камітэт унітарнае (рэвалюцыйнае) канфэдэрацыі працы агаласіў адозву з заклікам неадкладна распачаць збор сродкаў на прадпрыёмствах на карысьць бастуючых 35 тысяч гарнякоў поўдню і 12 тысяч шэкстыльшчыкаў поўначы.

У КІТАІ ГАСПАДАРЧЫ ЗАНЯПАД.

ПЕКІН, 8-1. З новага году тут зачынілася 477 крам. Мяркуецца, што перад кітайскім новым годам зачыніцца яшчэ большы лік крам.

ЧЫГУНАЧНІКІ ДАВЕДЗЕНЫ ДА РОСПАЧУ.

ПЕКІН, 8-1. Больш 300 зволеных супрацоўнікаў управы Цянцьзін - Пукоўскае чыгункі ў Цзынані заснаваюць „клюб самазабойцаў" і легчы на рэйкі, калі міністр шляхоў ня выдасьць ім іх заработку, які ня выплачваўся на працягу апошніх 9 месяцаў.

СПРЭЧКІ З ЯПОНЦАМІ ЗА РУХАВЫ СКЛАД ЦЯНЦЬЗІН-ПУКОЎСКАЕ ЧЫГУНКІ.

ПЕКІН, 8-1. Прадстаўнік японскае місіі ў Пекіне агаласіў заяву, у якой адхіляе высунутае кітайскімі ўрадавымі коламі абвінавачаньне, нібы японскае войска затрымлівае ў Цзынані рухавы склад, які належыць Цянцьзін-Пукоўскай чыгунцы. У заяве зазначаецца, што большасьць вагонаў і цягнікоў гэтае чыгункі былі захоплены і вывезены або на поўнач адступаючым войскам Чжан-Цзун-Чана, або на поўдзень войскам нац. армі

Суднабудаўнікі Гамбургу бяз працы.

БЭРЛІН, 8-1. Адміністрацыя заявіла баставаўшым суднабудаўнічым рабочым, якія зьявіліся ўчора на працу, што праца можа быць адноўлена толькі паступова.

52 гадзіны ў паветры.

НЬЮ-ЁРК, 8-1. 3-хматорны вайсковы самалёт сыстэмы „Фокера" зрабіў у Лос-Анжэлосе рэкорды на даўжыню палёт. Самалёт прабыў у паветры на працягу 51 гадз. 40 хвіл., атрымліваючы гаручае в іншага самалёту на трубах.

Новы французкі сатрап у Марока.

ПАРЫЖ, 2-1. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Замест Стэйта, які падаўся ў адстаўку, французкім генэральным камісарам у Марока назначан Люсьсен Сэн, які да гэтага часу выконваў абавязкі генэральнага камісара ў Тунісе.

Земляздры

VIII ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ БВА.

Даклад Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

З прамовы тав. ГАМАРНІКА.

Ад ЦК КП(б)Б гарачае камуністычнае прывітаньне VIII партканфэрэнцыі Беларускай Вайсковай Акругі і пажаданьне пасьпяховай дзелавой працы на далейшаму ўзмацненьню партыйнай арганізацыі, на згрупаваньню шэрагаў кампалітскладу, па ўсямернаму ўмацненьню баяздольнасьці нашай Чырвонай армії, часьцей разьмешчаных на важнейшай мяжы Савецкага Саюзу.

Таварышы! У сваім дакладзе, які я абавязкова пастараюся ўкласьці ў рамкі рэгляменту, я спынюся толькі на галоўных вузлавых пытаньнях, з пункту гледжаньня вынікаў працы Кампартыі Беларусі і задач, якія стаяць перад намі, а таксама на некаторых пытаньнях працы вайсковай партарганізацыі.

Мінулы год быў годам рэалізацыі настановаў XV партзьезду, быў годам рашучага ўздыму нашай эканомікі, шпаркага тэмпу індустрыялізацыі, рашучага наступу на прыватна-капіталістычныя элементы горада і вёскі і адначасова быў годам значных няшкасьцяй—ластаўкі хлеба і інш. тавараў, няжкасьцяй, зьвязаных з ростам, якія партыя на чале рабочай класы перамагала, зьмягчала і будзе перамагаць. Гэты год ва ўнутрыпартыйным жыцьці характэрны вычлененьнем з партыі пасьля XV зьезду трацкістаў, барацьбой партыі з усякімі рэшткамі трацкізму і барацьбой асабліва шырока разгорнутай у апошні час супроць галоўнай зараз правай небясьпекі, барацьбой на два фронты і супроць примірэнцтва. Агульныя вынікі году: мы ідзём шпарка ўгару, пасьпяхова разгортваем сацыялістычнае будаўніцтва, вядзём барацьбу з клясавым ворагам, адваёўваем усё новыя і новыя пазіцыі для сацыялізму, мацутна разгортваем індустрыялізацыю краіны, разгортваем культурную рэвалюцыю, але поруч з гэтым назіраецца вельмі недастатковы тэмп сельскай гаспадаркі і за гэта зьвяно нам трэба ўхапіцца з усёй сілай, каб і ў далейшым забясьпечыць высокі тэмп індустрыялізацыі краіны. Вось асноўная характарыстыка мінулага году для усяго Саюзу і для БССР.

I. Вынікі гаспадарчага будаўніцтва па БССР.

Лічбы зьяўляюцца найлепшым паказальнікам вынікаў гаспадарчага будаўніцтва. Пагатаму я падам вам некалькі асноўных лічбаў: Прамысловая прадукцыя ў 1927-28 г. узрасла на 29,9 проц. супроць росту ў 1926-27 г на 13,7 проц., з 1923 г. яна ўзрасла ў два з паловаю разы. Удзельная вага валавай прамысловасьці прадукцыі склала ў 1927-28 г. 25,7 проц.—супроць 23,2 проц. у 1926-27 г. Буйная прамысловасьць мела ў адносінне да ўсёй прамысловасьці ў 1927-28 г. 66,1 проц.—супроць 56,9 проц. у 1926-27 г. Наёмны персанал узрос на 5,7 проц. пры росьце рабочых у ценавай прамысловасьці на 20 проц. Трэба асабліва падкрэсьліць, што лік рабочых в 1917 году ўзрос на 75 пр. Рост зарплаты па прамысловасьці ВСНГ БССР у 1927-28 г. складае 15 проц. пры росьце прадукцыйнасьці працы на 16,3 проц. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў 1926-27 г. рост прадукцыйнасьці працы ў два разы адставаў ад зарплаты. Капітальныя затраты на электрыфікацыю ў 1927-28 г. складалі 4750 тыс. руб. супроць 1815 тыс. руб. у 1926-27 г. Рэспубліканскі і мясцовы бюджэт узрос на 14,5 проц. Экспарт даў 12,8 млн. руб. супроць 8,1 млн. руб. у 1926-27 г. Зьніжэньне сабекошту прадукцыі прамысловасьці—прыблізна на 5 проц. і будаўнічы індэкс удалося зьнізіць на 9 проц.

Асабліва трэба зьвярнуць вашу ўвагу на сельскую гаспадарку. Валавая прадукцыя земляробства ўзрасла на 4,2 проц. Калі параўнаць прадукцыю збожжа з 1926 г., дык 1927 г. даў павялічэньне на 4 проц., а 1928 г.—на 12,1 проц. Па лёну, калі прыняць 1926 г за 100, дык валавы фонд дае ў 1926 г.—127,6, а ў 1928 г.—139,4 проц., але ўраджайнасьць яго ўсё-ж ніжэй даваеннага. Такім чынам, мы і ў галіне сельскай гаспадаркі маем рост, але рост вельмі недастатковы, які ня можа нас ні ў якой ступені здаволіць. Ураджайнасьць, таварнасьць сельскай гаспадаркі вельмі нізкія, і за гэта зьвяно нашай народнай гаспадаркі нам трэба ўхапіцца ўсёй сілай, каб дабіцца рашучага ўздыму сельскай гаспадаркі. Для беларускай, у асноўным карлікавай, сялянскай гаспадаркі пытаньне аб калектывізацыі, як генэральным шляху ўздыму сельскай гаспадаркі, мае асаблівае значэньне і кампартыя Беларусі павінна на калектывізацыю зьвярнуць вялікую ўвагу. Пытаньне аб узьняцьці ўраджайнасьці павінна таксама быць у цэнтры ўвагі ўсёй партыі.

Я падаў вам, таварышы, лічбы, ілюструючыя рост народнай гаспадаркі Беларусі, а зараз хачу дапоўніць іх лічбамі, характарызуючымі напрамак гэтага росту, характарызуючымі сацыялістычны сэктар.

Аграмаджаны сэктар:

а) удзельная вага яго ў асноўных фондах усёй народнай гаспадаркі ў 1925-26 г.—7,8 проц., у 1926-27 г.—8,5 проц., у 1927-28 г.—9,7 проц.;

б) у прадукцыі ўсёй народнай гаспадаркі: 1925-26 г.—20,9 проц., у 1926-27 г.—22,6 проц., у 1927-28 г.—25,7 проц.;

в) у прамысловасьці ўдзельная вага ў асноўных фондах складае 84,3 проц., у прадукцыі 79,5 проц.;

г) у гандлёва-пасрэдніцкім звароце: у 1926-27 г.—75,9 проц., у 1927-28 г.—84,3 проц.;

д) у спажывецкай кааперацыі лік найшчыкаў узрос з 490 тыс. чал. да 650 тыс. чал., г. зн. на 33 проц., і ў сельска-гаспадарчай кааперацыі з 285 тыс. да 385 тыс., г. зн. на 35 проц. Пасякапленьне ўзрасло ў спажывецкай кааперацыі на 154 проц. і ў сельска-гаспадарчай кааперацыі—на 70 проц.;

е) капітальныя ўкладаньні ў абагулены сэктар у 1927-28 г. складалі 57 млн. руб. супроць 43 млн. руб. у 1926-27 г., г. зн. рост на 31,4 проц.;

ж) лік калгасаў узрос у два разы—з 416 да 964.

Паказаныя лічбы гавораць аб значным росьце аграмаджанага сэктару, аб умацненьні яго.

Мы ішлі наперад, ішлі ўгару, але сустракалі нямала цяжкасьцяй, якія мы перамаглі і будзем перамагаць з бальшавіцкай настойлівасьцю. 1928-29 год патрабуе ад нас яшчэ большай увагі да гаспадарчага будаўніцтва. Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі прадугледжуць далейшы значны рост, напрыклад:

а) рост пасяўной плошчы ня меншы, чымся на 3 проц., і рост ураджайнасьці ня менш, чымся на 3 проц.;

б) разгарнуць новыя калгасы на плошчы ня менш 50 тыс. гэктараў;

в) пашырыць вытворчасьць прамысловасьці на 35 проц., пры зьніжэньні сабекошту прадукцыі на 7 проц. і ўзьняць прадукцыйнасьць працы на 17 проц. і зарплату на 8 проц;

г) павялічыць экспарт на 18 млн. рублёў;

д) павялічыць удзельную вагу сацыялістычнага сэктару ў асноўных фондах усёй народнай гаспадаркі на 2,2 проц., ва ўсёй прадукцыі на 6,1 проц. і ў гандлёва-пасрэдніцкім звароце на 4,3 проц.

Мы поўнасьцю і цалкам рэалізуем плян далейшага разгортваньня народнай гаспадаркі, намечаны кантрольнымі лічбамі, калі дабʼёмся падвышэньня якасьці ўсёй нашай працы. Трэба ўмацніць барацьбу супроць бюракратызму, за сумленныя адносіны да справы ўсяго савецкага апарату, за выразную клясавую лінію. Трэба павесьці шалёную барацьбу супроць усякіх непарадкаў на вытворчасьці, за суровы рэвалюцыйны вытворчы распарадак. Прафсаюзы павінны значна ўмацніць сваю працу, бліжэй стаць да рабочай масы, да вытворчасьці.

II. За Ленінскую лінію.

Мінулы пасьля XI зьезду кампартыі Беларусі і XV зьезду УсесКП(б) шэраг быў шэрагам выключэньня з партыі трацкістаў, барацьбы з імі, як з контр-рэвалюцыянэрамі, і ўнутрыпартыйнаўчай працы, узмацняючай імунітэт усёй партыі супроць найменшых элементаў рэцыдыву трацкізму.

Адначасова партыі прышлося ўзмоцнена разгарнуць рашучую барацьбу супроць правай небясьпекі, якая павялічылася ў сувязі з абвастрэньнем клясавай барацьбы, у сувязі з шэрагам гаспадарчых цяжкасьцяй, зьвязаных з вялікім тэмпам індустрыялізацыі краіны, і зрабілася на сучасным этапе асноўнай, галоўнай небясьпекай. Мне няма патрэбы падрабязна спыняцца на гэтым пытаньні на вашай канфэрэнцыі, бо ладаўна ўсе гэтыя пытаньні шырока абмяркоўваліся на партактывах, а пасьля на акруговых партканфэрэнцыях. Кампартыя Беларусі досыць аднадушна дала рашучы адпор усякім правым хістаньням і примірэнцтву, адначасова ня спыняючы барацьбы супроць трацкізму. І задача партыі зараз у тым, каб рашуча і далей весьці гэту барацьбу на два фронты і супроць примірэнцтва. Пытаньні аб правай небясьпецы, аб правым ухіле, аб карэньнях яго, аб характарыстыцы яго, аб канкрэтных вызўленьнях яго патрабуюць самай падрабязнай прапрацоўкі ва ўсіх парторганізацыях, ва ўсіх ячэйках. Ня гледзячы на тое, што лістападаўскі пленум ЦК УсесКП(б) даў вычэрпваючую характарыстыку правага ўхілу, што ўвесь наш друк аддае гэтаму пытаньню вялікую ўвагу, мы ўсё-ж маем нямала прыкладаў неразуменьня з боку некаторых партыйцаў сутнасьці правага ўхілу і ўсёй небясьпекі яго для партыі. Але адначасова з далейшай мабілізацыяй увагі партыі да барацьбы з правай небясьпекай, як з галоўнай, нельга ні на хвіліну забываць неабходнасьці весьці барацьбу і супроць трацкізму. Калі я ўвайшоў сюды да вас у залю пасяджэньняў, я зьвярнуў увагу на тое, што ў вас вісіць плякат, на якім напісан выразна лёзунг аб барацьбе супроць правай небясьпекі і примірэнцтва, але, нажаль, ня мог знайсьці лёзунгу аб неабходнай рашучай барацьбе і супроць трацкізму. Мы вядзём і павінны зараз весьці барацьбу на два фронты і гэтага нельга забываць і тады, калі пішам лёзунгі для залі пасяджэньняў канфэрэнцыі. Я, зразумела, ні ў якой меры не сумняваюся, што і ПУОКР і вы ўсе тут прысутнічаючыя вядзеце ўсю сваю працу пад знакам барацьбы супроць ухілаў, на два фронты, лінію ПУОКР'а ў гэтым пытаньні я лічу зусім правільнай. Але зьвярнуў я вашу ўвагу на лёзунгі ў гэтай залі, каб яшчэ больш завастрыць увагу на барацьбе на два фронты. Змагайцеся рашуча супроць правага ўхілу, змагайцеся супроць трацкізму.

III. Нацыянальнае пытаньне.

Аб задачах у гэтым пытаньні на бягучым этапе сказана поўнасьцю ў рэзалюцыі апошняга пленуму ЦК КП(б)Б і многа і падрабязна гаварылася на апошніх акруговых партканфэрэнцыях. Шэраг фактаў, падзей, як справа на «Октябре», выступленьне некалькіх чалавек на бабруйскім партактыве з патрабаваньнем дакладу на расейскай мове, памылкі тэатральнай дыскусіі, антыпартыйныя лісты Александровіча і Заразцкага—прымусілі нас з усёй сілай завастрыць пытаньне перад кампартыяй Беларусі аб забясьпячэньні ва ўсёй працы, асабліва зараз на ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы, выразнага правядзеньня нацпалітыкі, далейшага рашучага разгортваньня беларусізацыі, узмацненьня выхаваўчай працы працоўных мас у духу інтэрнацыяналізму, барацьбы з шавінізмам і з усякімі ўхіламі ад бальшавіцкай лініі ў нацпытаньні.

Я лічу неабходным завастрыць і вашу, вайсковай партарганізацыі Беларускай Вайсковай Акругі, увагу на нацпытаньні, на ўмацнае іх працы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню чырвонаармейцаў, па абслугоўваньню культурных патрэб чырвонаармейцаў розных нацыянальнасьцяй і ў першую чаргу па пытаньнях беларусізацыі, паколькі гутарка ідзе аб працы ў часьцях, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. У адпаведных матэрыялах ПУОКР сьцьвярджае недастатковасьць працы сярод беларусаў, ня гледзячы на вялікую праслойку іх у часьцях акругі, таксама недастатковасьць яшчэ працы сярод украінцаў, палякаў, яўрэяў, чувашоў і г. д., а таксама і тое, што неабходна значна ўзмаціць барацьбу супроць антысэмітызму, які праявяецца ў казармы. Нягай ваша канфэрэнцыя завастрыць увагу ўсёй партарганізацыі на гэтым пытаньні. Наша армія—зброя пралетарскай дыктатуры, яна стаіць на варце Савецкага Саюзу і сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, яна інтэрнацыянальна па духу свайму, у ёй кожны чырвонаармеец прысягае на вернасьць справе сацыялізму, і мы абавязаны кожнага прыбываючага ў чырвоную казарму маладога рабочага і селяніна выхаваць у духу сапраўднага інтэрнацыяналізму. Правільнае вырашэньне гэтага пытаньня ўмацняе баяздольнасьць нашай Чырвонай арміі.

IV. Рост партыі.

Партыя за год вырасла з 25.776 чал. да 31.694 чал., рост—на 23 проц., пры росьце рабочых на 36,1 проц. і росьце рабочых ад варштату на 50,5 проц.

Склад партыі наступны: на 1 студзеня 1928 году: вытворчых рабочых—34,6 проц., батракоў—1,2 проц., сялян—10,6 проц. і служачых—53,6 проц.; на 1 кастрычніка 1928 г. вытворчых рабочых—37,2 проц., батракоў—2,1 проц., сялян—12,2 проц. і і служачых—48,5 проц.

Асобна належыць адзначыць, што у партыі толькі ўсяго 293 калгасьнікі, г. зн. 0,35 чал. на адзін калгас. Як бачыце з вышэйпадаўзеных лічбаў, у нанўнасьці рост партыі і палепшаньне сацыяльнага складу яе. Але вынікі зусім здавальняючымі прызнаць мы ня можам Перад намі з усёй вострасьцю стаіць задача далейшага ўцягваньня ў партыю рабочых, занятых на вытворчасьці, батракоў, сялян-калгасьнікаў і задача ачысткі партыі ад варожых, чужых элементаў.

V. Самакрытыка.

Самакрытыка, як мэтад выхаваньня нас, як сыстэма працы паступова ўсё больш пачынае праяўляць усю нашу працу. Першыя крокі зроблены, некаторыя посьпехі—у наяўнасьці. Выкрыта цэлая куча гнойнікаў, ачышчан ад варожых элементаў шэраг устаноў, выключаны з партыі вызўленыя шкурнікі, кар'ерысты, п'яніцы, злосныя бюракраты. Самакрытыка, пралетарская дэмакратыя, унутрыпартыйная дэмакратыя ўсё глыбей і шырэй разгортваюцца. Але пакуль што гэта толькі першыя крокі. Трэба з усёй рашучасьцю, адважнасьцю разгортваць самакрытыку, каб яна зрабілася непадзельнаю часткаю ўсяе нашае працы. Чымся мацнейшаю будзе самакрытыка, чымся больш бязьлітасна яна будзе выкрываць усе нашы недахопы, тым больш моцнаю будзе наша партыя, тым мацнейшаю будзе дыктатура пралетарыяту, тым карацей будзе наш шлях да сацыялізму.

Цяпер некалькі слоў аб армейскіх пытаньнях. Зразумела, усё тое, што я казаў да гэтага часу, яно цалкам і поўнасьцю цікавіць вас і датычыць вас, бо армія кроўна зьвязана з працоўнымі, жыве агульным жыцьцём сацыялістычнае краіны, і вайсковая партыйная арганізацыя—непарыўная частка ўсяе партыі. Усе пытаньні партыі цалкам і поўнасьцю гэта пытаньні кожнага з вас камуніста, які знаходзіцца ў арміі, таксама, як і ўсе пытаньні жыцьця партыйнай арганізацыі ў арміі—гэта пытаньні ўсяе партыі. І вось, падыходзячы з гэтага пункту гледжаньня да працы вайсковай партыйнай арганізацыі ў БВВ, я хацеў-бы вельмі коратка спыніцца на некалькіх пытаньнях:

1) Сувязь мясцовых арганізацый з арміяй.

Пачну з арганізацыйнае сувязі вайсковай партыйнай арганізацыі з партыйнымі арганізацыямі Беларусі. У складзе ЦК КП(б)Б мы маем 10 вайсковых таварышоў, у акругкомах—48 таварышоў. Пры азнаямленьні з матэрыяламі акругкомаў выявілася, што акругкомы параўнаўча часта слухаюць даклады вайсковых арганізацый і аказваюць ім пасільную дапамогу ў працы. Але, адзначаючы ў цэлым ня кепскую верхавінную, калі так можна сказаць, сувязь вайсковых з цывільнымі арганізацыямі, мы павінны адзначыць, аднак, недастатковую сувязь нізавую, масавую. На гэта трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу, трэба палепшыць і ўмацніць шэфскую працу.

2) Аб самакрытыцы ў арміі.

У сваей справаздачы ПУокр піша: „У сваім кастрычнікаўскім лісьце ўсім партыйным арганізацыям ПУокр адзначаў ужо, што сапраўднае пралетарскае самакрытыкі з уцягненьнем у яе шырокіх партыйных мас у нас яшчэ няма. Апошняя перавыбарчая кампанія хоць і адзначае некаторы зрух у гэтай галіне, усё-ж пацьвярджае ў асноўным гэты вывад. Партыйная арганізацыя ББВ павінна рашуча разгарнуць самакрытыку на аснове дырэктыў партыі і ПУР'у.

Пралетарская самакрытыка яшчэ больш умацуе баяздольнасьць нашае арміі, узьніме культурны ўзровень мас. Успомніце, як ставіў пытаньне Ільіч. Ён у 1918 г. пісаў у артыкуле «О характере наших газет»—«Ці пікуем мы палахлівых камандуючых, знак, ці ачарнілі мы перад Расеяй палкі, нікуды нявартыя? Ці выкрылі мы дастатковую колькасьць жэнскіх узораў, якіх трэба было-б з найбольшым гамам выключыць з арміі за нягоднасьць, нядбайнасьць, за спазьненьне і інш.? У нас няма дзелавое, бязьлітаснае, сапраўды рэвалюцыйнае вайны з канкрэтнымі насіцелямі зла"?.

Ці няма ў нас зараз недахопаў у армейскай працы? Зразумела ёсьць. Ці патрэбна адважнай самакрытыкай іх выкрываць, біць па канкрэтных насіцелях зла? Зразумела, неабходна, і чым самакрытыка будзе больш рашучай, пралетарскі вытрыманай, тым усё мацнейшымі будуць шэрагі нашае Чырвонае арміі.

3) Яшчэ больш увагі да быту, да патрэб чырвонаармейцаў.

Няма і ня было ў сьвеце другой арміі, у якой бы так шчыльна, братэрскі былі зьвязаны між сабою салдат і камандзір, як у нашай арміі. Наша армія рабоча-сялянская, у ёй чырвонаармеец, камандзір і палітпрацаўнік служаць справе пралетарскае рэвалюцыі, нашая армія зброя пралетарскае дыктатуры. Таму ўважлівыя, чулыя адносіны да быту, да патрэб чырвонаармейца вызначаюцца ўсім характарам, касьцяком нашае Чырвонае арміі.

Але бывае і ў гэтым пытаньні шэраг асобных бюракратычных скажэньняў з боку некаторых асоб, і з гэтым неабходна рашучая барацьба і асабліва з боку партыйных арганізацый і палітпрацаўнікоў. У справаздачы Пуокр'у я чытаю: „На кожныя занядужаньні далі нязначнае зьніжэньне, бо прычыны, якія выклікаюць за сабою павышаную сьцёртасьць ног чырвонаармейцаў (недастатковая прыгонка абутку і малы разьмер ануч) у поўнай меры ня былі зьнішчаны». Мне думаецца, што такія дэфэкты, як недастатковая прыгонка абутку і малы разьмер ануч пара было-б ліквідаваць. Трэба яшчэ больш увагі зьвярнуць на дробязі, рашуча змагаючыся з бюракратычнымі адносінамі да быту чырвонае казармы. У быту вялікае значэньне граюць дробязі, асобныя невялікія дэфэкты, ліквідацыя якіх не патрабуе вялікіх выдаткаў, а толькі патрабуе чулых, уважлівых адносін з боку кампалітскладу.

4) Аб вярбоўцы ў партыю.

У партыйнай арганізацыі ББВ ёсьць, бязумоўна, шэраг посьпехаў у справе рэгуляваньня росту партыйнае арганізацыі. Але я не магу не зьвярнуць увагі на тое, што ў акрузе ёсьць 7 тысяч рабочых, не ахопленых ні партыяй, ні камсамолам, у той час, як у партыйную арганізацыю прыняваць іншы раз зусім чужыя элементы, якім месца зусім ня ў арміі. Адгэтуль вывад, што партыйная арганізацыя акругі павінна зьвярнуць больш увагі справе рэгуляваньня росту, уцягненьню ў партыю рабочых, сялян-беднякоў.

На гэтым давольце, таварышы, скончыць, зьвярнуўшы таксама вашу ўвагу на неабходнасьць поўнае да канца сумленнае ліквідацыі ўсіх тых памылак, шкодных памылак, якія мелі месца ў рэзалюцыі майскае нарады пры Пуокр'ы і пажадаць далейшага згуртаваньня шэрагаў кампалітскладу і ўмацаваньня партыйнай арганізацыі.

ВЫБІРАЕМ САВЕТЫ.

У ЧАС СПРАВАЗДАЧНАЕ КАМПАНІІ ЎЗМАЦНІЎСЯ БЛЁК БЕДНАТЫ І СЕРАДНЯЦТВА. ЯШЧЭ БОЛЕЙ ЗАМАЦУЕМ ГЭТЫ БЛЁК НА ПЕРАВЫБАРАХ.

За 100% удзел у перавыбарах саветаў.

Бабруйскае акруговае аддзяленьне саюзу савгандслужачых выклікала ЦП саюзу на разгортваньне працы за 100 процантны ўдзел членаў саюзу ў перавыбарчай кампаніі. Цэнтральнае праўленьне камандыравала 3 членаў прэзыдыуму на 2 тыдні для ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі ў Бабруйшчыну, Магілеўшчыну і м. Лагойск, Менскай акругі.

Калектыў працаўнікоў галоўнай касы ашчаднасьці выклікаў працаўнікоў беларускай канторы Дзяржстраху на 100 проц. удзел членаў калектыву ў перавыбарчай кампаніі.

Кулацкаму падхалімству далі адпор.

(Аршаншчына).

З студзеня ў вёсцы Бэстрані, Карэбскага сельсавету, Дрыбінскага раёну быў выбарчы сход сяброў сельсавету. Булкі гэтай вёскі Каласкоў Міхась, Каласкоў Лухім, Салаўёў Васіль і Сідаронкаў Аксей, якія плацяць с.-г. падатку 210 руб., хацелі правесьці ў сябры сельсавету свайго падкулачніка Маркава Фёдара.

Кулацкі падхалім Аўраменкаў Аксей ледзь ня плакаў аб лесе кулацтва. Чаму-ж гэта ен абараняе інтарэсы кулакоў? Ды таму, што ён пакрыўлены. Некалі, пры Бурдзілаўшчыне ў Дрыбіне, ён быў сябрам РВК і меў шчыльную сувязь з гэтым кулаком. А потым, калі яго, як непатрэбны элемэнт, выкінулі з установы... ён і стаў ворагам савецкай улады і пачаў абараняць інтарэсы кулака. Ён думае, што калі савецкая улада дала шырокую дэмакратыю ў выбарах сельсавету, дык удасца правесьці свайго прыяцеля.

Адкрыта ў вочы бяднячкі-жанчыны Бурдукова, Шэварава, Шлевдава і Маркава казалі ім, што мы вас не дапусьцім у саветы, кіраваць вам саветамі не даверым, бо вы зьяўляецеся шкоднікамі ў пабудове новага жыцьця. Беднота правяла сваіх прадстаўнікоў у сельсавет. Прысутнічаючы.

Перавыбары прайшлі добра.

(Азярышчанскі с.-с., Самахвалаўскага р-ну).

5 студзеня на нашаму с.-савету прайшлі перавыбарчыя сходы. На сходы зьявілася 63 проц. усіх выбаршчыкаў, а таксама было шмат жанчын.

Усе сходы як перавыбарчыя, таксама і справаздачныя, прайшлі пад знакам генэральнага агляду працы сельсавету. Гэта тлумачыцца тым, што па с.-савету няма кулакоў і іншых ворагаў савецкае улады.

Выпрацаваны наказ з малымі дабаўленьнямі быў адзінадушна прыняты. У склад с.-савету абралі 23 сябры і 7 кандыдатаў, з якіх 4 жанчыны, супроць ранейшага складу 1 жанчына. Па партыйнасьці ёсьць адзін камсамолец-партыец, які абраны аднагалосна старшынёй с.-савету. Па сацыяльнаму складу—палова беднаты, палова сумленных середнякоў.

Таксама аднагалосна пастановілі правесьці самаабкладаньне на 25 процантаў, з якіх 5 проц. вызначылі на пабудову Дому Селяніна ў м. Самахвалавічы. К. Макарэвіч.

Дэпутаты перад выбаршчыкамі.

(Бабруйскі гарсавет).

На справаздачны сход дэпутатаў членаў саюзу будаўнікоў зьявілася 96 проц. Зала клюбу на 400 чалавек адчуваецца ўмясьціць усіх жадаючых. Будаўнікі гаворыць, што такое актыўнасьці яшчэ ня было. Чутна гутарка сярод рабочых такога зьместу:—„Хай гавораць толькі аб сваей фактычнай рабоце, прэзыдыум за сябе сам зробіць справаздачу, калі што ня так,—адлічам". Пасьля адчыненьня сходу ніхто з дэпутатаў ня хоча пачаць першым—быццам спужаліся...

Прымушаюць Краснэра. 500 удзельнікаў сходу адразу заціхаюць. Тав. Краснэр гаворыць, што ён працаваў у сэкцыі РСІ, прымаў удзел у камісіі па абсьледаваньні цагельні, дзе выяўлена, што бухгальтар, каб атрымаць звыштэрміновую працу пры складаньні балянсу, затрымліваў штодзённую работу. Выкрыты два выпадкі пратэкцыянізму пры пасыльцы на работу.

Дэпутат Караеў, рабочы, працаваў у зямельнай сэкцыі, член бюро. Сэкцыя правяла вялікую працу па разьмеркаваньню зямельных вучасткаў. Камісія сэкцыі, у якой удзельнічаў т. Караеў, не дапусьціла высяленьня рабочага з дому Позьняка. Апошні, жадаючы пазбавіцца ад кватарантаў рабочых, дабіўся тэхнічнага акту на рамонт доку і справу давёў да пракурора.

Камісія сэкцыі, пазнаёміўшыся са справай на месцы, запрапанавала, каб рабочыя часова занялі два пакоі ў гэтым самым доме і такім чынам пасьля рамонту рабочыя засталіся на месцы.

За два гады свайго паўнамоцтва Караеў, як дэпутат, робіць справаздачу сваім выбаршчыкам толькі другі раз. Гэта ён сам лічыць вялікім недахопам. Рабочыя ў спрэчках зазначалі, што дрэнную справаздачнасьць дэпутатаў ён нават гарсавет і саюз. Уносіліся нават прапановы, каб абвясьціць выгавар. Далей у спрэчках зазначалася, што пры разьмеркаваньні зямельных вучасткаў—лепшыя даваліся заможным і служачым, якія потым гэты вучастак прадаюць. Фальчар Сарокін мае ўласны дом і атрымаў найлепшы вуч сток, пабудаваў дом і цяпер яго прадае за 4.000 руб.

Па пытаньні аб перавыбарах саветаў будаўнікі даюць дырэктыву сваёй брыгадзе, якая накіроўваецца ў вёску каб у склад саветаў былі абраны беднякі і лепшыя середнякі, гэтым умацніцца сувязь вёскі з горадам. Прымаецца прапанова аб тым, каб будаўнікі дапамагалі прыгарадным вёскам правесьці перавыбары, не дапусьціўшы ў саветы падкулачнікаў.

Сход скончыўся а 11 гадзіне. Нарэшце жадаючыя прыняць удзел у спрэчках выказаліся. Актыўнасьць рабочых выбаршчыкаў сапраўды надзвычайна вялікая.

Л—ч.

Канец справаздачнай і пачатак перавыбарнай кампаніі па райёну.

(Узьдзенскі райён, Меншчына).

Да 1 студзеня 1929 году па райёну скончылася падрыхтоўчая праца да перавыбараў.

Вынікі праведзенай справаздачнай кампаніі наступныя: у 90 проц. перавыбарчых вучасткаў праведзены сходы беднаты, праведзены нарады беспартыйнага бяднацкага актыву. Даклады аб удзеле у перавыбарах сельсаветаў ставіліся і абгаварваліся на ўсіх, якія праводзіліся ў райёне, сходах і канфэрэнцыях: на міжаюзным сходзе, на райканфэрэнцыях—настаўнікаў, жанчын, дзяўчат, чырвонаармейцаў і моладзі.

Праведзена па райёну 37 падрыхтоўчых сходаў моладзі, 30 сходаў жанчын. З недахопаў справаздачнай кампаніі заўважаны—недастатковы ўдзел у справаздачных сходах па некаторых сельсаветах выбаршчыкаў, асабліва жанчын.

З 1 студзеня 1929 году пачалася кампанія перавыбараў. Кампанія гэта будзе праводзіцца так:—з 1-га па 15 студзеня праведзены будуць перавыбары ў адной палове райёну, а з 15-га па 30-1—у другой. Каб павялічыць процант удзельнікаў у перавыбарах—будзе праводзіцца падворны абход з запрашаньнем усіх на сход. У перавыбарах павінна ўдзельнічаць ня менш 60 проц. выбаршчыкаў. У склад новых сельсаветаў будзе праведзена ня менш 30 проц. жанчын. Распачатая кампанія перавыбараў ідзе здавальняюча. Пропант выбаршчыкаў павялічыўся. Праведзеныя перавыбары ў некаторых вёсках далі досыць здавальняючыя вынікі.

Селькор.

Якая падрыхтоўка--такія і вынікі.

Гомель, 9-1. Аб падрыхтоўцы да справаздачнае кампаніі гарсавету гутараць ужо даўно. Акрпрафсавет своечасова даў дырэктывы саюзным арганізацыям і клюбам аб разгортваньні шырокае працы на прадпрыемствах з тым, каб да моманту афіцыйнага пачатку справаздачнае кампаніі была сканцэнтравана ўвага выбаршчыкаў на асноўных пытаньнях нашага будаўніцтва, на забясьпечаньні 100-процантнае явкі на справаздачныя сходы.

Між тым, першыя справаздачныя сходы гарсавету нам паказваюць, што ня ўсюды саюзныя арганізацыі даволі добра праводзілі падрыхтоўчую працу. Агульныя сходы рабочых наведваюцца недастаткова. Прафактыў, які павінен паказваць прыклад, таксама слаба ўдзельнічае ў справаздачай кампаніі.

Рабочыя клюбы зусім не распачалі правядзеньня працы па справаздачай кампаніі гарсавету. Усе пастановы на асобных нарадах з клюбнымі працаўнікамі, дзе былі дэтальна распрацаваны мерапрыемствы па ўдзелу клюбаў у перавыбарчай кампаніі, засталіся нявыкананымі.

Гэтыя факты нас пераконваюць, што пастановы пленуму акрпрафсавету па пытаньні правядзеньня перавыбараў саветаў ня ўсюды мелі патрэбны адбітак. Калі у бліжэйшы час ня будзе рашучага пералому—справаздачная кампанія на дасьць патрэбных вынікаў.

„Новай тактыцы" кулацтва—жорсткая барацьба.

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

— Ня пускайце нашых ворагаў у савет. Пільна гледзіце за кулаком і яго «штучкамі». Бараніце саветы ад тых, хто шкодзіць нашай працы, хто ўводзе розныя паклёпы на савецкую ўладу.

Так заклікала селькораў Жлобінскага райёну на іх райённай нарадзе 6-га студзеня селькорка Мікалаева.

— Гледзіце-ж, кажу,—заклікала т. Мікалаева,—бо кулак, наш вораг, сілком пнецца ў сельсавет.

А гэты наш вораг запраўды гвалтам лезе ў савет.

Для большасьці кулацтва і для нэпманаў дэльверы ў савет зачынены. Сьпісы пазбаўленых выбарчага права, якія вывешаны каля дзьвярэй кожнага сельсавету і райвыканкомаў, гэтыя нямыя вартаўнікі бяднацка-серадняцкага сельсавету пільна абараняюць уваход у савет нашых ворагаў і моўчкі, але рашуча кажуць яму:

— Стой. Далей нельга!

У Жлобінскім райвыканкоме гэтыя сьпісы занялі паўсьцячы ў калідоры. 656 асоб пазбаўлена выбарчых правоў па гораду Жлобіну, 650—па райёну.

І вось кулак, спрабуючы пралезьці ў савет, імкнецца абыйсьці нашы законы і калі не самому ўлезьці ў савет, дык працісьнуць туды сваіх прыхільнікаў.

Да 5-га студзеня па Жлобінскаму райёну адбыліся перавыбары у 26 вучастках. Абрана 105 членаў сельсаветаў. З гэтага ліку камуністаў абрана 21, камсамольцаў—11, жанчын абрана 22.

Перавыбары праходзілі жива. Наведваньне перавыбарчых сходаў у сярэднім складае 63 проц.; найменшы процант явкі на сходы 49 (Чацьвярнянскі с.-с.) і найбольш—75 (Малевіцкі с.-с.).

Выглядаецца ўзрост актыўнасьці жанчын, удзел якіх у перавыбарчых сходах складае 48 проц. У большасьці вучасткаў праходзілі кандыдацкія сьпісы, якія выстаўлялі бяднацкія групы і партыйныя і камсамольскія ячэйкі.

Усё гэта сьведчыць аб узросшай актыўнасьці бяднацка-серадняцкай часткі вёскі, аб росьце сьвядомасьці вясковай жанчыны, гэта сьведчыць аб росьце аўтарытэтнасьці партыі і камсамолу ў вёсцы і аб тым, што бядняк у вёсцы ўжо робіцца рэальнай палітычнай сілай, якая ў саюзе з серадняцтвам забірае ў свае рукі кіраўніцтва жыцьцём вёскі.

Алё поплеч з гэтым першыя вынікі перавыбараў саветаў па Жлобінскаму райёну сьведчаць і аб росьце актыўнасьці кулака, аб яго новых «мэтадах» барацьбы.

У сваіх стараньнях пралезьці ў савет у сваёй барацьбе за ўплыў у сельсавеце кулак ужо адкрыта ня выступае; ён працуе цішком, скарыстоўвае розных «быўшых», а таксама несьвядомыя бяднацкія адзінкі і некаторых середнякоў і за іх сьпіной лезе ў савет, як «ідэйны кіраўнік». Напрыклад, у 5 выбарчых вучастках не прайшлі сьпісы груп беднаты і партыйных ячэек. Прычым—супроць сьпісаў ня было ніякіх выступленьняў, кандыдатур не абгаварвалі, не давалі адводаў, іх проста не галасавалі. Напрыклад, на Завадзкім вучастку (Чаць вярнянскі с.-с.) кандыдацкі сьпіс ячэйкі спаткалі моўчкі і гэтым праваліл. Сход высунуў сваіх кандыдатаў, сярод іх бедняка, але такога, які цалкам пад уплывам кулацтва. Тое самае было і на Дарагашчанскім выбарчым вучастку (Дарагашчанскі с.-с.).

У Калыбаўцы (Чацьвярнянскі с.-с.) беднота высунула кандыдатам у савет камсамольца Анішчанку. Камсамолец Анішчанка актыўны, талковы хлапец, але... дужа сумленны.

Ён, будучы ўпаўнаважаным па ахове лесу мясцовага значэньня, нікому не даваў спуску, пільна бараніў лес ад самавольнага вынішчэньня. І вось багацеі пусьцілі чуткі, што Аніш

Вынікі сацыялістычнага будаўніцтва да дзесяцігодзьдзя БССР*).

(Даклад тав. Галадзеда на Юбілейнай Сэсіі ЦВК БССР 31-га сьнежня 1928 г.).

Электрыфікацыя і энэргетычная база народнай гаспадаркі.

Пара лічбаў аб нашых дасягненьнях у галіне электрыфікацыі. Вы т. т. ведаеце, што асноўная прадпасылка пасьпяховай індустрыялізацыі і нашага будаўніцтва гэта ёсьць падвід сьпіс над усё нашае будаўніцтва вышэйшай тэхнічнай базы, а таксама арганізацыя энэргетычнай базы, бо толькі на падставе вышэйшай тэхнікі, толькі на падставе скарыстаньня дасягненьняў у навуцы мы зможам пасьпяхова прасоўвацца наперад па шляху індустрыялізацыі. Галоўным вымерчікам тэхнічных дасягненьняў і падвядзеньня тэхнічнай базы пад нашае будаўніцтва вылучаецца электрыфікацыя. І вось да сучаснага моманту мы маем такое становішча, калі ў нас у дарэвалюцыйным часы на душу насельніцтва выпрацоўвалася і спажывалася электраэнэргіі 0,9 кілёват гадзіны ў год, дык у сучасны момант мы ўжо выпрацоўваем і спажываем у сярэднім 5,6 кілёват гадзіны на душу насельніцтва. Як бачыце, тэмп прыросту вялізарны. Асабліва важна адзначыць, што патрэбы ў электраэнэргіі ўсёй нашай вытворчасьці настолькі шпарка растуць, што перад намі стаіць вялічэзная задача павялічэньня тэмпу электрабудаўніцтва, хоць і тыя лічбы, якія я агалосіў ужо гавораць аб вялізарным тэмпе прыросту электраэнэргіі. Я не гавару ўжо аб тым, што ў бліжэйшыя гады мы пусьцім у ход такога гіганта, як Асінбуд. Мы думаем скончыць у першую чаргу пабудовы Асінбуду ў 1930 годзе. Трэба адзначыць, што Асінбуд каранным чынам зьдзіме выпрацоўку электраэнэргіі, як асноўная тэхнічная база і база энэргетычная, і дасьць, бязумоўна, вялікі зьльвіг у галіне тэхнікі ў нашай народнай гаспадарцы, у першую чаргу у прамысловасьці. Трэба сказаць, што Асінбуд правядзе сапраўдную рэвалюцыю ў народнай гаспадарцы.

Таваразварот і рост сацыялістычных элемэнтаў

Трэба яшчэ адзначыць аб даволі значных дасягненьнях у галіне таваразвароту. Я павінен сказаць, што пазіцыя сацыялізму на важнейшым вучастку эканамічнай змычкі гораду і вёскі ў галіне таваразвароту зьвяўляецца адным з важнейшых монапаў эканамічных узаемадносін рабочае клясы з сялянствам, прамысловасьці з сельскай гаспадаркаю, і у гэтай галіне нашай працы роль сацыялістычнага сэктару зьвяўляецца таксама важнаю.

Як мы на агульным фоне росту таваразвароту, які, бязумоўна, у нас вылучаецца значным, узмацнеем сацыялістычны, аграмаджаны сэктар? Гэта мы можам прагледзець на наступных лічбах: дзяржаўны і кааперацыйны гандаль у сучасны момант займае ва ўсім таваразвароце 84,3 проц. Як бачыце, роль яго ў абслугоўваньні працоўнага насельніцтва неабходнымі прадуктамі спажываньня і прадметамі, якія патрабуюцца для працоўных мас, вялізарнае. Адсюль, паміж іншым, у сучасны момант задача палепшаньня якасьці нашай гандлюючай сеткі як дзяржаўнай, гэтак і кааперацыйнай, бо на 84,3 проц. увесь таваразварот знаходзіцца ў руках аграмаджанага сэктару. Гэта гаворыць адначасна і аб тым, што сацыялістычны сэктар цьвёрда і паступова займае пануючае палажэньне на рынку таваразвароту, тым самым выцясьняе прыватна-гандлёвы капітал. Трэба сказаць, што гэта ёсьць вялізарнае дасягненьне ў сацыялістычным будаўніцтве. Але гэтае-ж зьявішча ў свой час накладае вялікі абавязак на наш аграмаджаны гандлюючы сэктар, абавязак палепшаньня якасьнага абслугоўваньня патрэб працоўных мас.

Нашыя ўкладаньні.

Для сканчэньня характарыстыкі нашага дасягненьня на фронце гаспадарчага будаўніцтва я прыведу яшчэ наступныя лічбы: усіх укладаньняў у нашую народную гаспадарку на працягу апошніх трох год, улічваючы і прыватны сэктар, мы зрабілі 322,8 млн., дык яшчэ па транспартнаму будаўніцтву, аб эрудываньні якога ў часы акупацыі і бандытызму я вам гаварыў, які больш за ўсё пацярпеў ад акупацыі, імпэрыялістычнай вайны і бандытызму, мы таксама зрабілі вялікія капітальныя ўкладаньні. Я не гавару ўжо аб тым, што мы цалкам аднавілі ўсе разбураныя масты і пабудавалі шмат новых, не гавару таксама і аб тым аднаўленьні разбураных у 1920-21 годзе прадпрыёмстваў, якое было праведзена на чыгунцы; я прыведу толькі тое, што было ўкладзена за 1926-27 і 1927-28 гады на чыгунках: па МББ і Заходніх чыгунках укладзена на капітальнае будаўніцтва за гэтыя гады 31232 тыс. руб. Калі дадаць яшчэ гэтыя транспартныя ўкладаньні да тых укладаньняў, якія мы зрабілі ў народную гаспадарку без транспарту, дык вы ўбачыце вялічэзныя сумы, якія трацілі дзяржава на адбудову і аднаўленьне нашай народнай гаспадаркі.

Дасягненьні культурнага будаўніцтва.

Якія дасягненьні мы маем у галіне культурнага будаўніцтва? На буду падрабязна спыняцца на гэтым, бо ў нашым друку і ў прыватнасьці ў юбілейных газэтах вы знойдзеце досыць матар'ялу для таго, каб уявіць сабе фактычныя вынікі ўсяго нашага будаўніцтва цалкам, у тым ліку і культурнага будаўніцтва. Я толькі павінен вам сказаць, што мы маем вялізарныя дасягненьні ў галіне разгортваньня школьнае сеткі. Напрыклад, ахоп дзяцей школьнага ўзросту мы маем ужо ў памерах 73 проц. усіх дзяцей школьнага ўзросту. У галіне ліквідацыі пісьменнасьці мы маем наступныя лічбы: сярод мужчын лік пісьменных паменшыўся на 31 проц., сярод жанчын на 18 проц., а разам лік пісьменных паменшыўся на 26 процантаў.

Я не буду паўтараць тое, што на раз гаварылася аб значных дасягненьні ў галіне разгортваньня сеткі вышэйшае асьветы, разгортваньня навуковай працы на Беларусі і г. д. Значэньне навукова-дасьледчай працы для ўсіх членаў ЦВК зразумела, тым больш, калі ўспомніць, што нашая краіна ў дарэвалюцыйныя часы амаль што зусім не дасьледвалася; на гэтым фоне значэньне навукова-дасьледчай працы стане для ўсіх зусім відавочнай. Гэта ёсьць важнейшая неадымная частка сацыялістычнага будаўніцтва, якая павінна дапамагаць нам больш дасканала і ўсебакова скарыстоўваць унутраныя магчымасьці нашай рэспублікі, выявіць тую энэргію і тыя матар'яльныя рэсурсы, якія заложаны ўнутры нашай дзяржавы, а скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў для сацыялістычнага будаўніцтва ў максымальным разьмеры зьвяўляецца адной з галоўнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва. Асабліва гэта важна для падтрыманьня належнага тэмпу будаўніцтва.

Трэба адзначыць, што ўрад Савецкай Беларусі да гэтага часу аддаваў значную ўвагу разьвіцьцю навукова-дасьледчай працы.

Беларуская Акадэмія Навук.

Адным з найвялікшых дасягненьняў за 10 год зьвяўляецца тое, што мы заўтра адчыняем вышэйшую навуковую установу на Беларусі—Беларускую Акадэмію Навук. Толькі Кастрычнікавая рэвалюцыя, толькі дыктатура пралетарыяту для магчымасьць беларускаму працоўнаму народу будаваць такія установы. А што гэта дасягненьне, якое мы маем у галіне навукова-дасьледчае працы, мае вялікае значэньне, пра гэта сьведчаць гутаркі нашых клясавых ворагаў—заходніх суседзяў. Досыць прачытаць выпіскі з адной бульварнай фашысцкай газэты—„Віленскае Слова", як яна адзываецца на ўзьніканьне такой установы, як Акадэмія Навук. Вось што піша «Віленскае Слова» пад загалоўкам «Беларуская Акадэмія Навук»:

«Стараючы дзесяць, прыблізна, год таму назад папяровыя «савецкія рэспублікі»—Беларусь і Украіну, і робячы гэта як дзеля таго, каб надакучыць Польшчы, так і для замірэньня ўнутранага нацыянальнага кіпеньня на гэтых абшарах, цэнтральныя бальшавіцкія органы ў Маскве не ўясьнілі сабе ў належнай меры ўсёй небясьпекі гэтага мерапрыёмства, бо штучна разбуджаныя беларускі і украінскі нацыяналізмы пачалі хутка расквітаць, прыносячы шэраг клопатаў уладарам чырвонага Крамлю. Каб ня страціць ролі пратэктару, „вазраждаючыхся націй", чырвоныя маскоўскія дыктатары прымушаны былі згадзіцца на ўсё новыя і на ўсё больш рыскованыя канцэсіі і ўступкі на карысьць беларусаў і украінцаў, дзякуючы якім (уступкам) украінскія і беларускія абшары настолькі аддзяліліся ад усяго Савецкага Саюзу, што гэта пагражае разьвіцьцю яго ўнутры праз адыход гэтых земель. Гэтая небясьпека зьвяўляецца тым больш актуальнай, што на грунце тэрытарыяльнага нацыянальнага аддзяленьня сярод насельніцтва гэтых абшараў (асабліва украінскага), пашыраюцца стыхійна сэпаратысцкія тэндэнцыі. Адной з трох уступак на карысьць беларускага руху зьвяўляецца пастанова ЦВК і СНК у Менску 4-га гэтага месяца, падпісаная Чарвяковым, Галадзедам і Хацкевічам, аб рэарганізацыі Інстытуту Беларускай Культуры ў Менску у Беларускую Акадэмію Навук. Гэтая рэарганізацыя павінна быць скончана да 1-га студзеня 1929 г., як дню, у які будзе сьвяткавацца дзесяць год існаваньня Савецкай Беларусі"...

Далей, паміж іншым, „Віленскае Слова" прыводзіць выпіскі з нашых газэт аб паступовым працэсе разгортваньня працы Інбелкульту і піша наступнае:

„Інстытут у кароткія часы так пашырыў сваю дзейнасьць, што трэба было дакладна акрэсьліць яго арганізацыйную будову шляхам выданьня спэцыяльнага акту. Савнарком БССР зацьвердзіў у 1924 годзе спэцыяльны статут Інстытуту Беларускай Культуры. Пачынаючы з 1924 г., Інстытут разьвіваецца яшчэ больш шпаркім тэмпам і мае ўжо 7 сталых сэкцый і 8 камісій. Гэта разьвіцьцё ідзе так, што ў 1927 годзе стала відаць, што Інстытут даўно ўжо перайшоў нормы, акрэсьленыя для яго статутам 1924 году. У зьвязку з гэтым паўстае пытаньне аб перайменаваньні Інстытуту ў Акадэмію. Пагэтаму 7-га лістапада 1927 г. Савнаркомам БССР быў зацьверджан новы статут Інстытуту...

... Рэалізацыя гэтых прынцыпаў амаль цалкам упадобіла Інстытут да такіх арганізацый, як Украінская альбо Усесаюзная Акадэмія Навук"...

Як бачыце, фашысцкі друк хоча даказаць, што ўзьніканьне такіх устаноў, як Беларуская Акадэмія Навук, зьвяўляецца прымушаным крокам, што гэта ёсьць нібыта уступка з боку „Чырвонага Крэмля". А мы ім на гэтае скажам: справа ня ідзе тут аб уступках, а справа ідзе аб тым, што рабочыя і сяляне так шпарка растуць, што нават фашысцкія пісакі і аглянуцца няма калі, бо толькі на падставе гэтага росту, на падставе таго, што наша народная гаспадарка і культура так шпарка насувалася наперад, мы можам арганізаваць у сябе такую высокую навуковую установу, як Акадэмія і інш.

Тут трэба асабліва адзначыць матывы азлобленых фашыстаў, якія ўсякія нашыя дасягненьні на фронце гаспадарчых і культурных дасягненьняў імкнуцца тлумачыць тым, што мы гэта робім нібыта дзеля таго, каб „надакучыць Польшчы". Я павінен сказаць, што наша будаўніцтва, у тым ліку і рэарганізацыя Інстытуту Беларускай Культуры ў Акадэмію, на ёсьць імкненьне „надакучыць" паважаным панам Польшчы, а ім трэба ўразумець, што нават усё наша сацыялістычнае будаўніцтва зьвяўляецца тым гістарычным намінучым ходам падзей, якое ідзе ў разрэз з інтарэсамі капіталістаў і абшарнікаў.

Зразумела, што самы факт існаваньня магутнага Савецкага Саюзу Сацыялістычных Рэспублік, самы факт разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і ў БССР, зьвяўляецца вельмі нежаданым мерапрыёмствам для яснавяльможных паноў і абшарнікаў. І калі-б мы толькі імкнуліся не „надакучыць" тым людзям, якім непрыемны нашыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, то выходзіць, што мы не павінны нічога рабіць. Мы-ж ім скажам: як-бы мы ні глядзелі на той энтузіязм, які пранёўяюць рабочыя і сяляне ўсяго Саюзу, і ў тым ліку Савецкай Беларусі, мы ўсё-такі будзем напружваць усю нашу энэргію, усе нашы магчымасьці на замацаваньне сацыялізму ў першай ва ўсіх сьвеце пралетарскай дзяржаве.

Далей, як вы чулі, фашысцкі друк піша аб якіхсьці ўступках, дзякуючы якім нібыта украінскія і беларускія абшары аддзяліліся ад усяго Савецкага Саюзу. Мы павінны голасам рабочых і сялян Савецкай Беларусі моцна на гэта адказаць: вашы мары, яснавяльможныя паны і фашысты ўсякіх масьцей, застануцца толькі марамі. Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік настолькі моцны ў сваёй сувязі народаў усіх нацыянальнасьцяў, што колькі-б вы ні адурачвалі працоўныя масы аб тым, што украінскія і беларускія абшары аддзяляюцца, вам справакаваць нікога ня ўдасца. Як беларускія, гэтак і украінскія рабочыя і сяляне вельмі добра ведаюць, што толькі ў цеснай сувязі ўсіх саюзных рэспублік, усіх народаў і нацый, аб'яднаемых СССР могуць быць мыслімы посьпехі ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту; рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі заяўляюць, што яны раз назаўсёды зьвязалі свой лёс з працоўнымі усяго Савецкага Саюзу і зьвяўляюцца лепшым яго перадавым атрадам на мяжы з капіталістычным захадам, і што нікому, у тым ліку і фашыстам, ня ўдасца парушыць моцны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Я на буду гаварыць аб вялікіх дасягненьнях у іншых галінах культурна-нацыянальнага будаўніцтва, бо гэта адняло-б у мяне шмат часу. Досыць яшчэ ўказаць толькі на тое, што за апошнія часы нашымі выдавецкімі установамі выдана больш 1 з пал. млн. таму беларускай літаратуры. Гэта такая лічба, над якой трэба задумацца, бо калі ў дарэвалюцыйныя часы над нашай моваю паны сьміяліся, абшарнікі і капіталісты зьдзекваліся, дык цяпер адзначаецца, што выдана больш за 1 з пал. млн. таго літаратуры, на якой выхоўваецца беларускі рабочы і селянін, выхоўваецца на сваёй родной беларускай мове. Гэтыя лічбы сьведчаць і аб значных дасягненьнях у галіне культурна-нацыянальнага будаўніцтва.

III. Цяжкасьці і недахопы працы.

Таварышы, калі мы гаворым аб нашых бясспрэчных станоўчых выніках ва ўсіх галінах будаўніцтва, нам адначасна ня трэба забываць і аб недахопах у нашым будаўніцтве, і аб цяжкасьцях, якія суправаджаюць нашу творчую будаўнічую працу. Калі мы падводзім станоўчыя вынікі нашай працы ў 10-цігадочы юбілей, мы павінны гаварыць і аб тым, дзе ў нас яшчэ да гэтага часу дрэнна. Я думаю, што на Сэсіі ЦВК БССР трэба адкрыта зазначыць, што мы яшчэ маем шмат недахопаў у нашай працы. Напрыклад, у нашым дзяржаўным апараце мы маем яшчэ шмат непразаванага бюракратызму; у нашым будаўніцтве, на гледзячы на нашыя бясспрэчныя посьпехі, якіх ніхто ня можа абвяргнуць, мы бачым, што мы яшчэ ня зусім навучыліся хутка і танна будаваць, што нам яшчэ будаўніцтва каштуе дорага, і доўгі час мы трацім на тое, каб яго скончыць, а гэта мае вялікае значэньне.

І вось, таварышы, калі мы маем вялічэзныя вялікі тэмп росту нашага народна-гаспадарчага разьвіцьця, якога ня ведала ніводная буржуазная краіна да гэтага, калі мы гаворым аб тым, што гэта можа зрабіць толькі пралетарыят, які пануе ў сваёй дзяржаве, мы не павінны забываць аб тым, што гэты тэмп росту нам патрэбен яшчэ больш, і што мы павінны яго павялічыць. А павялічыцца шпарка будаваць, танна будаваць і будаваць добра па якасьці—гэта і ёсьць адзін з сродкаў, які будзе дапамагаць павялічэньню тэмпу нашага будаўніцтва. Чаму мы павінны тэмп будаўніцтва павялічыць? Таму, што мы будуем сацыялізм ва ўмовах капіталістычнага абкружэньня. Усе абкружаючыя ўмовы нашай працы прымушаюць нас усё больш і больш павялічваць тэмп нашага будаўніцтва, каб дагнаць і перагнаць у эканамічных і тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя дзяржавы. Адсюль і выцякае задача на 2-е дзесяцігодзьдзе—вучыцца лепш будаваць, таньней будаваць. Гэта задача зьвяўляецца для нас абавязковай.

Таксама няма чаго зачыняць вочы і на тое, што ў нас яшчэ ў канцы дзесяцігодзьдзя ёсьць такія зьявішчы, што мы ня зьнішчылі тэй спадчыны, якая нам засталася ад дарэвалюцыйных часоў—гэта наўнасьць някультурнасьці сярод шырокіх мас. Някультурнасьць—гэта адваротны бок у быту рабочых і сялян, адваротны бок у агульным сацыялістычным будаўніцтве. Пытаньне аб культурнасьці, аб аздараўленьні быту працоўных мас зьвяўляецца неадымнай часткай будаўніцтва сацыялізму, бо сацыялістычнае будаўніцтва патрабуе ад нас уздыму культурнасьці мас, аздараўленьня быту, бо тады рабочая кляса будзе мець яшчэ большыя посьпехі, калі яна будзе і фізычна і культурна ўзмацняцца.

Задача савецкай улады заключаецца ў тым, каб разам з дасягненьнямі на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ўзмацняць і фізычнае аздараўленьне рабочае клясы, а гэта залежыць ад культурнасьці, ад палепшаньня бытавых умоў, ад таго, як рабочая кляса зможа свае сілы, сваю энэргію прыстасаваць да больш эфэктыўнага скарыстаньня на карысьць сацыялізму. Пытаньне культурнай адсталасьці і недарэчнасьцяў у быту працоўных мас цалкам залежыць ад таго, як сур'ёзна будзе зьвернута ўвага на зьнішчэньне гэтай някультурнасьці і адмоўных бакоў у быту з боку шырокіх рабочых і сялянскіх мас.

Вядома, што шырокія колы працоўных мас ужо далёка прасунуліся наперад па шляху ўзыму сваёй культурнасьці. Калі паглядзець на тое, якімі буйнымі крокамі пралетарыят і працоўнае сялянства заваёўвае культуру, дык можна толькі дзівіцца. Гіганцкая хваля культурнага і творчага энтузіязму вахапіла мільённыя масы. Энэргічнае накіраваньне руху на заваёву культур з боку працоўных—гэта ёсьць факт. Але гэтага яшчэ недастаткова. Хуткі тэмп сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе яшчэ большай культурнасьці, яшчэ большай рашучай барацьбы з нашай адсталасьцю, з цяжкай спадчынай у быту і г. д.

На другое дзесяцігодзьдзе мы павінны паставіць, як абавязковую задачу, уздым культурнасьці, аздараўленьне быту.

Аб'ектыўныя цяжкасьці ў нашым будаўніцтве

Трэба адзначыць, што мы маем і аб'ектыўныя цяжкасьці ў нашым сацыялістычным будаўніцтве. Гэтыя цяжкасьці наступныя: мы будуем ва ўмовах капіталістычнага абкружэньня, мы будуем сваімі ўласнымі сродкамі, мы робім тое, чаго не рабіла ніводная капіталістычная дзяржава. Няма на сьвеце такой дзяржавы, якая-б індустрыялізавалася альбо аднаўлялася і ў гаспадарцы без дапамогі чужаземнага капіталу. А Савецкі Саюз, у тым ліку і наша беларуская дзяржава, як частка Савецкага Саюзу, гэта адзіная краіна, якая будуе ўласнымі сродкамі, сродкамі пралетарыяту і працоўнага сялянства, і ў той-жа час, будуючы ўласнымі сродкамі, вытрымлівае такі нячуваны высокі тэмп нашага росту.

Другая наша аб'ектыўная цяжкасьць гэта тое, што мы будуем сацыялізм таксама і ў умовах клясавай барацьбы і наяўнасьці шматмільённай дробнай вытворчасьці. Гэтыя ўмовы складаюць аб'ектыўна цяжкія ўмовы для будаўніцтва, з якімі нельга ня лічыцца. Гэта прымушае нас яшчэ больш напружваць нашу энэргію дзеля перамогі гэтых аб'ектыўных супярэчнасьцей. Але важна адзначыць, што на падставе гэтых цяжкасьцей, якія суправаджаюць нашае будаўніцтва, клясавы вораг, які ёсьць яшчэ і ўнутры нашай дзяржавы, імкнецца скарыстаць гэтыя цяжкасьці, і рашучаму наступленьню сацыялізму на капіталістычныя элементы ён аказвае ўпартае супраціўленьне. На падставе нашага росту, на падставе больш рашучага выступленьня сацыялістычных элемэнтаў на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі мы бачым абвастраньне клясавай барацьбы, і гэтая клясавая барацьба з боку нашага клясавага ворага накіравана па затрымку нашага прасоўваньня наперад на шляху сацыялізму. Нас хочуць трымаць за полы, нам ставяць палкі ў калёсы пры будаўніцтве сацыялізму. Але трэба мець на ўвазе, што клясавая барацьба ня зьнішчыцца да тэй пары, пакуль пралетарыяту ня ўдасца канчаткова арганізаваць сацыялістычную грамаду, што ўмовы ўнутранай, а тым больш вонкавай клясавай барацьбы будуць вісець увесь час цяжкім брэмям над нашым сацыялістычным будаўніцтвам.

На падставе гэтых цяжкасьцей, у якіх праходзіць рост сацыялістычнага будаўніцтва, мы бачым нават і хістаньні ў асобных шэрагах рабочых, сялян, працоўнай інтэлігенцыі і нават у асобных праслойках нашай партыі. Ажыўленьне дзейнасьці буржуазна-капіталістычных элемэнтаў цісьне ўсёй сваёй вагою на шэрагі партыі, на шэрагі пралетарыяту (зразумела, на менш устойлівыя шэрагі партыі і пралетарыяту), і гатыя менш устойлівыя элементы сярод рабочае клясы і партыі паддаюцца гэтаму націску буржуазна-капіталістычных элемэнтаў, ня вытрымліваюць яго, пачынаюць хістацца, пачынаюць сумнявацца ў правільнасьці таго шляху, па якому мы ідзём і будуем сацыялізм, пачынаюць думаць аб тым, ці ня трэба перагледзець праграму нашага будаўніцтва.

Наша задача, сьвяткуючы нашае дзесяцігодзьдзе, бачыць гэтыя цяжкасьці, не зачыняць вачэй і ўсімі мерамі перамагаць гэтыя цяжкасьці, а ўсім малаўстойлівым і хістаючымся элемэнтам як па-за партыяй, гэтак і ўнутры партыі, мы павінны заявіць: таварышы, зараз мы, гэта значыць пралетарыят і працоўнае сялянства, пад кіраўніцтвам партыі, знаходзімся на крутым уздыме на гару сацыялізму; зараз ускіпіць сумненьні ў нашых шэрагах, ускіпіць хістаньні і наўпаўненасьць ёсьць простая перашкода нашай сацыялістычнай працы. Мы павінны сказаць адкрыта: хто сумняваецца ў правільнасьці нашага шляху, хто хістаецца, хто пасуе перад цяжкасьцямі, хто хоча цягнуць нас за палу назад і не даваць узьбірацца на круты ўздым сацыялізму, прэч рукі, не цягніце нас назад, партыя і пралетарыят пройдуць міма вас (воплескі). А вы бачыце, што на падставе гэтых цяжкасьцей у нас растуць хістаньні, хістаньні як у галіне гаспадарчага будаўніцтва, так і ў галіне культурнага будаўніцтва, і гэта адно з другім зьвязана. Наша праграма будаўніцтва ёсьць праграма будаўніцтва гаспадаркі і культуры, і там, дзе ёсьць хістаньні і сумненьні ў правільнасьці праграмы сацыялістычнага будаўніцтва па лініі гаспадарчай працы, і там, дзе ёсьць хістаньні і сумненьні ў ажыцьцяўленьні праграмы культурнага будаўніцтва,—гэта ёсьць адна і тая-ж рэч, рэч нявер'я ў сілу пралетарыяту, нявер'я ў правільнасьць нашага шляху будаўніцтва сацыялізму, які вызначан бальшавіцкай камуністычнай партыяй.

Наша задача ў зьвязку з гэтым—мабілізаваць волю рабочае клясы, згуртаваць яшчэ мацней шэрагі, каб з посьпехам перамагаць цяжкасьці, якія суправаджаюць наша будаўніцтва. Мы павінны памятаць, што мы маем усе мажлівасьці дзеля таго, каб ня толькі захаваць тэмп нашага будаўніцтва, які нам дасягнут да гэтага часу, а нават яго яшчэ павялічыць. Мы маем вялізарныя рэзэрвы ўнутры нашай краіны як энэргетычныя, гэтак і матар'яльныя. Хто ня ведае, што пры мабілізацыі гэтых рэзэрваў—і людзкіх і матар'яльных — мы можам шпарка рухацца па шляху індустрыялізацыі. Наша задача ўсьведаміць аб тым, што мы маем усе мажлівасьці, каб мабілізаваць унутраныя рэсурсы, каб павялічыць тэмп нашага будаўніцтва, а для мабілізацыі ўсёй энэргіі і матар'яльнай, і фізычнай, і матар'яльных, і фізычных рэсурсаў нам хістаньні і сумненьні ў асобных праслойках непатрэбны. Мабілізаваць мы можам толькі тады, калі пралетарыят і асноўная маса сялянства вераць у правільнасьць нашага шляху. А што наш шлях да сацыялізму праз індустрыялізацыю правільны—гэта бясспрэчна.

IV. Задачы на другое дзесяцігодзьдзе.

Дазвольце мне яшчэ ў кароткіх словах вызначыць тыя асноўныя задачы і перспэктывы, якія партыя і савецкі ўрад намячаюць на другое 10-цігодзьдзе ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Сялянская Беларусь стане прамыслова-аграрнай

Я павінен адзначыць, што наша ўстаноўка на другое дзесяцігодзьдзе ў будаўніцтве сацыялізму, у разьвіцьці народнай гаспадаркі і культуры, заключаецца ў першую чаргу ў тым, што мы бярэм рашучы курс на павялічэньне ролі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР і на рэарганізацыю сельскай гаспадаркі на базе калектывізацыі і на базе новай тэхнікі.

Вось гэта наша галоўная ўстаноўка ў народна-гаспадарчым пляне на другое дзесяцігодзьдзе. Мы лічым, што наш абавязак, абавязак беларускай дзяржавы таксама заключаецца ў ажыцьцяўленьні праграмы індустрыялізацыі, што наша ці сутнасьці сялянская краіна—Беларусь—павінна на працягу другога дзесяцігодзьдзя ператварыцца ў прамыслова-аграрную краіну.

Вось нашая галоўная ўстаноўка, і мы разам з гэтым, на базе індустрыялізацыі, павінны рэарганізаваць і сельскую гаспадарку Беларусі.

Мы думаем, што ў ажыцьцяўленьні такой устаноўкі нам удасца на працягу бліжэйшых пяці год, гэта значыць, па 5-цігадоваму пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі, укласьці ў будаўніцтва прамысловасьці, прыкладна, 240 млн. руб. Такі ліміт—у 240 млн. р. капітальных укладаньняў у разьвіцьцё нашай прамысловасьці мы вызначылі на бліжэйшыя пяць год, і, мне думаецца, што мы гэты ліміт ажыцьцёвім. Праўда, мы канчаткова яшчэ не зацьвердзілі асноўных лімітаў і паказчыкаў для разьвіцьця народнай гаспадаркі, у тым ліку і па прамысловасьці, але гэтая паметка ёсьць па нашаму глыбокаму перакананьню рэальная паметка.

Мы таксама намячаем на бліжэйшыя пяць год, калі ажыцьцёвім праграму прамысловага будаўніцтва, павялічыць пра старскую базу, пашырыць кадр пралетарыяту на 150 процантаў супроць лічбы рабочых у сучасны момант. Мы думаем канкрэтна на працягу бліжэйшых пяці год будаваць наступныя галіны прамысловасьці.

Па лініі тэкстылю вызначаецца выдатканьне каля 30 млн. р., на ільнапрадзільныя, бавоўняна-папяр. прадпрыёмствы, палюлёзны камбінат і г. д. Па іншых галінах прамысловасьці, напрыклад, па мэталёвай, мы думаем разгарнуць яшчэ шырэй будаўніцтва сельска-гаспадарчых машын, а таксама станкабудаўніцтва і выраб пескладаных машын.

Мы таксама намячаем у бліжэйшыя пяць год шырока разгарнуць праграму будаўніцтва іншых галін прамысловасьці, у першую чаргу намячаем праграму хімізацыі Гэтую праграму хімізацыі мы будзем ажыцьцяўляць па лініі пабудовы фабрыкі штучнага шоўку, якую мы пачынаем будаваць у Магілеве з наступнай вясны.

Гэта ёсьць адно з прадпрыёмстваў, якое зьявіцца, па сутнасьці, вялікім крокам наперад, якое ўнясе каранныя змены ў структуру нашай прамысловасьці. Выраб штучнага валакна—гэта ёсьць праблема ня толькі БССР, гэта ёсьць праблема нават ня толькі СССР, гэта ёсьць праблема ўсёй Эўропы. І мы ўжо з вясны становімся на шлях практычнага ажыцьцяўленьня пабудовы фабрыкі штучнага шоўку.

Праграму хімізацыі мы будзем правадзіць і праз пабудову прадпрыёмстваў, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку. Напрыклад, выраб штучнага ўгнаеньня і г. д.

Калі ўзяць пытаньне аб перспэктывах утварэньня тэхнічнай базы і базы энэргетычнай, дык мы ўжо нашы прынцыповую згоду Ураду Саюзу на тое, каб намеціць задачу пабудовы новай раённай электрастанцыі, ня меншай як Асінбуд, і такое прадпрыёмства мы ўжо ў нашай пяцігодцы вызначаем. Мы уносім прапанову, каб Сэсія ЦВК БССР у сваёй юбілейнай пастанове таксама дала загад Ураду аб распрацоўцы праекту пабудовы гэтай новай станцыі. Гэта задача — адна з каранных. Калі нам удасца (а мы, бязумоўна, упэўнены што нам удасца пабудаваць новую раённую электрастанцыю, раўную па велічыні Асінбуду), то гэта будзе адным з самых сурёзных мерапрыёмстваў на шляху падвядзеньня энэргетычнай і высока-тэхнічнай базы пад нашу праграму індустрыялізацыі.

Калектывізацыя сельскай гаспадаркі—генэральная лінія.

Па лініі сельскай гаспадаркі наша асноўная ўстаноўка—на разгортваньне шырокім тэмпам калектывізацыі. Другое дзесяцігодзьдзе існаваньня БССР павінна будзе рашучым чынам ператвараць нашую дробна-сялянскую вёску ў аграмаджаную сельскую гаспадарку. Пры нашай значнай цеснаце, пры ўмове вялікай колькасьці дробных сялянскіх гаспадарак, у нас асноўным генэральным шляхам за ўздыме сельскай гаспадаркі і сацыялістычнай рэканструкцыі палінен быць шлях калектывізацыі. Толькі шляхам вытворчага аб'яднаньня соцен і тысяч дробных сялянскіх гаспадарак мы зможам, як сьлед, шырокім тэмпам сацыялістычна рэканструіраваць сельскую гаспадарку і палепшыць дабробыт нашага сялянства.

Такім чынам, устаноўка на калектывізацыю ёсьць генэральная лінія на другое дзесяцігодзьдзе нашага ўраду, нашай партыі і ўсіх савецкіх арганізацый. У гэтым годзе мы маем вопыт і вопыт добры. За мінулы год мы арганізавалі па БССР 548 калектываў—за адзін год, а да мінулага году за ўсе часы існаваньня ўтворана 419 калектыўных аб'яднаньняў. Гэта значыць, за адзін апошні год мы павялічылі колькасьць сацыялістычных адзінак у сельскай гаспадарцы на 122,5 проц. Гэта ёсьць вялізарны крок наперад. Нам трэба на другое дзесяцігодзьдзе, улічваючы вопыт мінулага году і скарыстоўваючы яго, яшчэ шырэй разгарнуць працу па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, па шырокаму аб'яднаньню яе ў вытворчую сельска-гаспадарчую кааперацыю.

Яшчэ адно з важнейшых мерапрыёмстваў, якое мы павінны ажыцьцёвіць у новым дзесяцігодзьдзі—гэта ўзьняць ураджайнасьць, а таксама каранным чынам зьмяніць мэтады апрацоўкі зямлі і пашырыць агрыкультурныя мерапрыёмствы, бо трэба ведаць, што наша задача ўздыму ўраджайнасьці зьвяўляецца адной з галоўнейшых задач і трэба не цесна зьвязваць з ажыцьцяўленьнем агрыкультурных мерапрыёмстваў. Агрыкультурныя мерапрыёмствы павінны зьявіцца важнейшым сродкам па ўздыму ўраджайнасьці. Аб'ём капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку па дзяржаўнаму сэктару (бюджэт, кредыт і г. д.) мы мяркуем вызначыць у суме 376 млн. р. на бліжэйшае пяцігодзьдзе. Вось гэтым мы і вымяраем тэмп разьвіцьця сельскай гаспадаркі, разьвіцьце яе ў бліжэйшыя пяць год. Для ажыцьцяўленьня гэтага тэмпу будаўніцтва як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы нам трэба напружыць усе нашы сілы, усе рэсурсы—людзкія, матар'яльныя і грашовыя, бо без напружанай волі і энэргіі пралетарыяту і асноўных сялянскіх мас нам цяжка будзе выконваць пастаўленую праграму будаўніцтва, бо, як бачыце, тэмп разьвіцьця ў важнейшых галінах народнай гаспадаркі, у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы мы вызначаем досыць вялікі, і ажыцьцёвіць яго можна толькі мабілізаваўшы шырокія рабочыя і сялянскія масы.

V. Як мы ажыцьцяўляем нацыянальную палітыку.

Як мы выконваем задачы нацыянальнай палітыкі ў Савецкай Беларусі? Праграму і прынцыпы бальшавіцкай партыі, аб чым я ўжо вам гаварыў у пачатку майго дакладу, мы ажыцьцёвілі на ўсе 100 проц., арганізаваўшы самастойную дзяржаву—Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку ў складзе Саюзу ССР. Як мы практычна праводзім асобныя пытаньні нацыялітыкі ў нашай шматнацыянальнай краіне? Я павінен на гэта пытаньне даць такі адказ: усё тое, што мы маем у якасьці дасягненьняў на гаспадарчым фронце, аб чым я вам прывёў лічбы, ёсьць у першую чаргу асноўныя паказальнікі дасягненьняў у нацыянальнай палітыцы. Калі мы гаворым аб пытаньнях ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі, то было-б памылкова думаць, што пытаньні нацыянальнай палітыкі вырашаюцца толькі на культурным фронце. Бо камуністычная партыя ажыцьцяўляе праграму ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі ўперад за ўсё праз уздым эканомікі раней прыгнечаных нацый. Устаноўка партыі і ўраду вызначаецца ў тым, каб раней адсталыя краіны мелі моцны эканамічны грунт, на падставе якога можна было-б разгортваць і іншыя галіны нацыянальна-культурнага будаў

водная нацыі, у нас працоўныя ўсіх нацыянальнасцяй зьяўляюцца роўнымі сярод роўных, як і Савецкая Беларусь зьяўляецца роўнаю дзяржаваю сярод роўных дзяржаваў Савецкага Саюзу. Там прывілеіраванымі нацыянальнасьцямі ня толькі не дасцца магчымасьці нацыянальным меншасьцям зловальнець у мінімальным разьмеры свае патрэбы як у галіне культуры, гэтак і гаспадарчага жыцьця, а наадварот, праводзіцца іх поўны разгром.

IV. Мы ідзем шпарка да сацыялізму.

У заключэньне я павінен паставіць такое пытаньне. Мы разам з падагульваньнем вынікаў за першыя 10 год па будаўніцтву сацыялізму вызначылі ўжо цэлы шэраг задач на другое дзесяцігодзьдзе. Ці выканаем мы гэтыя задачы, якія мы вызначылі? Адказ можа быць толькі адзін: **так, выканаем.** Вопыт мінулага дзесяцігодзьдзя паказаў, што пралетарыят, вызначыў ны канкрэтную праграму, можа яе выканаць і выконае. Мы таксама зможам далкам выканаць і тую праграму, якую вызначаем на другое дзесяцігодзьдзе, але толькі пры адной умове: калі нам не перашкодзіць сусьветны імпэрыялізм, які ня кідае думкі аб ваеннай інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу. А тое, што ў адказ на палітыку міру, якая праводзіцца савецкім урадам за ўсе часы свайго існаваньня, мы маем шаленую падрыхтоўку ваеннай інтэрвэнцыі в боку імпэрыялістычнай буржуазіі, і ў першую чаргу з боку нашых суседзяў, гэта **ёсьць факт**, і гэты факт гаворыць аб тым, што нашай задачай у будаўніцтве сацыялізму павінна быць таксама і задача ўзмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны. Усё нашае будаўніцтва мы павінны дапасоўваць у першую чаргу так, каб яно ўзмацняла абароназдольнасьць нашай краіны, **бо толькі тады, калі мы будзем моцнымі, толькі тады і нашая праграма па будаўніцтву сацыялізму будзе рэальнай праграмай.** Калі наш клясавы вораг, сусьветны імпэрыялізм, будзе адчуваць, што ра очых і сялян Савецкага Саюзу, і ў першую чаргу, Савецкае Беларусі, голаю рукою ня возьмеш што ўсе думкі імпэрыялізму аб ваеннай інтэрвэнцыі супроць нашай краіны разваліцца ўшчэнт аб нашу арганізаванасьць і магутнасьць,—тады мы зможам рэальна ажыцьцяўляць нашу праграму. Нагэтаму адсюль выцякае задача і адносна ўзмацненьня Чырвонай арміі. Чырвоная армія ў сучасны момант зьяўляецца галоўным і самым надзейным вартаўніком сацыялістычнага будаўніцтва. Ад яе пільнага вока, ад яе магутнасьці будзе залежаць далейшае выкананьне нашай будаўнічай праграмы. Калі яна будзе моцна стаяць на межах Савецкага Саюзу, накіраваўшы свой штык на сусьветны імпэрыялізм, тады выкананьне праграмы будаўніцтва нашай гаспадаркі і культуры ў другім дзесяцігодзьдзі будзе забясьпечана на 100 проц. **Унутраныя магчымасьці і матар'яльныя і энэргетычныя, каб пабудаваць сацыялізм у нашай краіне, у нас ёсьць.** Нам трэба толькі адно, каб мы маглі спакойна будаваць, каб ніхто не пасьмеў на нас пасягнуць, каб наша абароназдольнасьць была забясьпечана цалкам.

Заканчваючы агляд нашых дасягненьняў да нашага дзесяці адозва сьвята і адзначыўшы далейшыя нашы задачы, я заканчваю свой даклад наступным:

Першае дзесяцігодзьдзе характарызуецца вялізарнымі дасягненьнямі па разьвіцьцю гаспадаркі і культуры, па ўсё большаму замацоўваньню саюзу рабочых з асноўнымі масамі сялянства. Другое дзесяцігодзьдзе перад намі разгортвае яшчэ больш шырокія кругавіды дзеля сацыялістычнага будаўніцтва. Тэмп сацыялістычнага будаўніцтва ў новым дзесяцігодзьдзі будзе яшчэ больш шпаркім, чым да гэтага ча у, і задача Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР заключаецца ў тым, каб заклікаць і мабілізаваць усе працоўныя масы да будаўнічай працы пад лёзунгам:

Наперад па шляхох індустрыялізацыі! Наперад да камунізму!

Нехай жыве Савецкая Беларусь! Нехай жыве яе дзесяцігодзьдзе!

Нехай жыве Саюз ССР!

Нехай жыве камунізм!

(Доўгія воплескі. — «Інтэрнацыянал»).

РАШУЧЫ АДПОР АНТЫСЭМІТЫЗМУ.

(На пасяджэньні пацкамісіі ЦВК БССР).

7-га студзеня пад старшынствам т. Хацкевіча адбылося пасяджэньне пацкамісіі ЦВК БССР, на якім заслухан даклад аб антысэмітызьме і мерапрыемствах па барацьбе з ім.

Антысэмітызм—праяўленьне капіталістычнага ладу.

Антысэмітызм мае свае карэньні ў далёкім мінулым. Той ваяжі гвалт над яўрэйскай нацыяй, які меў месца ў сярэдніх вякі, ёсьць барацьба гаспадароў-капіталістаў каталіцкай царквы і фэадалаў з яўрэйскім капіталам. Расейская буржуазія пры царыльме таксама выкарыстоўвала розныя сродкі ў барацьбе з яўрэйскім капіталам (дзяржаўны апарат, царкву, мяжу аседласьці, процантную норму ў школах і г. д.). Царскі ўрад скарыстоўваў яшчэ антысэмітызм, як сродак для зацьмяньня клясавай сьвядомасьці пралетарыяту і прадоўжэньня ўзнаці за падзяленьня рэвалюцыйнага руху. Лёзунгу рэвалюцыянэраў: «Прач самаўладзтва» царскія жандары і паны супроцьстаўлялі лёзунг: «Бі жыдоў»!

Кастрычніцкая рэвалюцыя разьбіла клясавага ворага, але не дабіла яго. У нашай гаспадарцы яго поўнасьцю на зьнішчаны капіталістычныя элементы. Зараз у выніку з узмоцненым тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва, у нас абвастрылася клясавая барацьба. На наш наступ капіталістычныя элементы горазу і вёскі (наймак і кулак) адказваюць узмацненьнем барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту. У сваей барацьбе ачастуваючым сацыялістычным будаўніцтвам нашы ворагі скарыстоўваюць усе сродкі, у тым ліку і той контр-рэвалюцыйны сродак, якім карыстаўся царызм,—антысэмітызм.

Контр-рэвалюцыйныя элементы скарыстоўваюць спадчыну мінулага—антысэмітызм для зацьмяньня клясавай сьвядомасьці працоўных, для адцягненьня іх увагі ад будаўніцтва сацыялізму.

Барацьба з антысэмітызмам павінна праводзіцца па двух напрамках:

а) шляхам прыняцьця суровых рашучых мер супроць сьвядомых контр-рэвалюцыйных элементаў, падбухторшчыкаў да антысэмітызму і

б) шляхам разгортваньня шырокай выхаваўчай працы сярод малясьвядомых працоўных, якія зьяўляюцца сьляпой прыладаю ў руках контр-рэвалюцыі, у іх барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту.

У гэтых мэтах неабходна, каб прафсаюзы ўзмацнілі працу сярод рабочых, знаёмячы іх з гісторыяй клясавай барацьбы пралетарыяту, з яе інтэрнацыянальным характарам.

Трэба ўзмацніць антырэлігійнае выхаваньне рабочых, захапляючы таксама і ўсё сям'ю яго, прасякаючы ў быт рабочага. Дзеля гэтага прафсаюзы павінны ўзяцца за падрыхтоўку кад аў антырэлігійкаў.

Адначасна з гэтым трэба зьвярнуць увагу на ўзмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня сялянства праз хату-чытальню і і інш. культ.-асьветныя арганізацыі і на інтэрнацыянальнае выхаваньне дзяцей у школах.

Органы НКЮ і інш. арганізацыі павінны своечасова рэагаваць на праўдзівы антысэмітызму і прымаць самыя рашучыя меры да пакараньня вінаватых.

З антысэмітызмам павінны змагацца самі рабочыя.

У абмеже думкамі на даклад тав. Будзіна выступілі т т. Хацкевіч, Бучакас, Аматрозіч, Кенсотскі.

— Антысэмітызм,—адзначыў тав. Хацкевіч у сваім выступленьні,—трэба разглядаць, як праўдзівае клясавае барацьбы. Некалькі дзесяткаў год таму назад яўрэйскі пралетарыят зьяўляўся непрымірымым ворагам царызму. Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі яўрэйскі рабочы стаў актыўным барацьбітом з буржуазіяй. Розныя контр-рэвалюцыйныя элементы—кулацтва, банды нападалі на яўрэйскіх рабочых, рабавалі і забівалі іх.

У пачатку рэвалюцыі антысэмітызм падтрымліваўся выключна ў колах кулацтва і старога чыноўніцтва. Па меры разьвіцьця НЭП'у, паколькі частка яўрэйскага насельніцтва іншу пачала займацца гандлем, антысэмітызм пачынае распаўсюджвацца і сярод найбольш адсталага і малясьвядомага элементу.

Антысэмітызм—гэта вылазка супроць дыктатуры пралетарыяту. У барацьбе з дыктатурай пралетарыяту контр рэвалюцыйныя элементы ўжываюць усе сродкі: антысэмітызм і паект хуліганства, п'янства. Кулацтва і старое чыноўніцтва, якія ненавідзяць савецкую ўладу, шукаюць балючае месца і заўсёды гатовы абрушыцца на бяднейшае яўрэйскае насельніцтва, на яўрэйскага рабочага, абы зацьмяніць клясавую сьвядомасьць пралетарыяту.

Да ня туленьня НЭП'у контр-рэвалюцыйныя элементы лаялі толькі Савецкую ўладу, засьля-ж НЭП'у, калі расейскі і інш. гандляр спатыкае на сваім шляху канкурэнтаў у асобе яўрэйскага гандляра, антысэмітызм пачынае зьяўляцца в усёй яўрэйскай нацыяй. Побач з кануністам ставяць яўрэя.

Што мы павінны рабіць у справе барацьбы з антысэмітызмам?

— Мы павінны ўзмацніць інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас. Трэба не давець спуску ўсялякім праўдзівым антысэмітызму, але гэтага яшчэ мала. Антысэмітызм—гэта антыпралетарскі рух, барацьбу з антысэмітызмам трэба праводзіць праз саміх рабочых, трэба, каб самі працоўныя масы выдзілілі гэту шкодную хваробу, каб яны самі выкідалі з сваіх шэрагаў тых прыйшлых да рабочае масы элементы, якія пад відам пасобных рабочых праводзяць ворагу контр-рэвал. справу.

У мэтах папулярызацыі нацыянальнай палітыкі партыі і Савецкай улады мы павінны паклапаціцца аб тым, каб выпусьціць папулярную літаратуру па зазначаньваму пытаньню, нам трэба выпусьціць папулярную кніжку для шырокіх працоўных мас і Савецкае працоўнае школы.

Для выпрацоўкі рэзалюцыі на гэтаму пытаньню выдзелена камісія.

Усебеларуская краязнаўчая канфэрэнцыя.

Сялянскі двор, як аб'ект краязнаўчага дасьледваньня.

(ДАКЛАД В. А. САМЦЭВІЧА).

Камуністычная партыя і савецкая ўлада паставілі перад навукаю пытаньне аб індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, аб падвышэньні ўраджайнасьці. Гэта задача вырашаецца ад начасова з вырашэньнем задачы культурнае рэвалюцыі сярод шырокіх працоўных мас. Пранясы інтэнсіфікацыі сельскае гаспадаркі і развіцьця культуры ў вёсны адбываюцца ў надзвычайна цяжкіх умовах, ва ўмовах барацьбы з старымі традыцыямі і звычаямі ў вядзеньні гаспадаркі ў вёсцы.

Задача кіраваўлаў—апачаць складаную і часамі малапрыкметную барацьбу старога ўкладу з новымі формамі быту, высьветлець кірунак, тэмп і спрыяючыя фактары сацыялістычнага будаўніцтва з аднаго боку, і перашкоды гэтаму будаўніцтву—з другога. Пранясы адмываньня старых форм гаспадаркі і быту вёскі, як эканамічна-сацыяльнага арганізму, адбіваюцца і на пасобных адзінках—дварох і, наадварот, усе зьмены ў пасобных гаспадарках у наччай меры робяць уплыў на жыцьцё вёскі. адсюль патрэба вывучэньня пасобных тыпаў гаспадарак: бядняцкай, серадняцкай, кулацкай. Грунтоўнае і ўсебаковае вывучэньне пасобных двароў (тыповых) будзе вельмі каштоўным для навукі, гаспадарчых і савецкіх органаў, для грамадзкіх арганізацый і школ. Вельмі важна вывучыць, як пасобныя гаспадаркі пераходзяць ад трохпалёўкі на шматпольле, як сялянае-вопытчыкі пераходзяць да больш інтэнсыўнай гаспадаркі, як вядзецца барацьба паміж новымі культурнымі гаспадаркамі і гаспадаркамі старога ўкладу, як пасобныя гаспадары пазбаўляюць свой дабрабыт і г. д.; патрэбна вывучыць бюджэт пасобных гаспадарак і тыя прычыны, якія перашкаджаюць пасобным катэгорыям двароў паляпшаць свой дабрабыт, стварыць больш сагадныя ўмовы для аховы двароў. Старыя самейныя ўстої руйнуюцца і нараджаюцца новыя ўзаемаадносіны паміж членамі сямі, новыя ідэалёгіі, новыя ж чаі. Справа краязнаўцаў паказаць, у якіх умовах усё гэта адбываецца і пад уплывам якіх прычын, якая тут роля партыі, камсамолу. Вывучэньне двара павінна стаць актуальнай задачай мясцовых краязнаўчых арганізацый пры ўдзеле саміх сялян. Вывучэньне можа праводзіцца шляхам непасрэдных назіраньняў і запісаў, зьбіраньня вестак па анкетах і шляхам экскурсій. Мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі павінны зьвярнуць увагу на монаграфічныя апісаньні пасобных тыповых двароў.

Падрыхтоўка краязнаўцаў.

(ДАКЛАД М. КАСЬПЯРОВІЧА).

Ліквідаваньне краязнаўчай непісьменнасьці усіх членаў прафесыянальных саюзаў, моладзі і вялікага самых шырокіх колаў насельніцтва БССР вымагаецца ня толькі як галоўны сродак да пашырэньня краязнаўчага руху ў сапраўды масавы рух, але і як самая важная ўмова пасьпяховай двойнасьці мясцовых краязнаўчых арганізацый.

Ліквідаваньне краязнаўчай непісьменнасьці в вінна адбывацца ў двох кірунках: а) набываньнем ведаў і навыкаў з галіны гісторыі і т орыі краязнаўства і б) набываньнем ужо вядомых ведаў аб сваім краі. Найбольш д ступнымі відамі працы па ліквідацыі краязнаўчай непісьменнасьці зьяўляюцца даклады, лекцыі і цыклі лекцый у школах, клюбах і хатах-чытальнях, на сходах сялян, партыйных і інш. грамадзкіх арганізацый, на канфэрэнцыях, зьездах і г. д. а таксама экскурсіі адведзенага характару і ўхілу.

Першае месца ў справе падрыхтоўкі краязнаўцаў павінна займаць увядзеньне курсу краязнаўства ва ўсе вышэйшыя школы БССР і ў тых тэхнікумы, у якіх ён яшчэ ня ўведзены і ўмацаваньне выкладаньня яго ў гэтых школах. Але гэтыя падрыхтаваныя такім чынам кадры краязнаўцаў прыдуць яшчэ на скора. Таму ЦБК і мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі павінны з свайго боку паклапаціцца падрыхтоўкай новых краязнаўцаў, а таксама павышэньнем кваліфікацыі вашых краязнаўцаў-самавукаў.

Самым галоўным відам працы ў гэтай справе павінна быць арганізаваньне метадычна-краязнаўчых студчык у больш моцных арганізацыях і пры ЦБК вызначаных яшчэ другім краязнаўчым зьездам, але практыкаваных толькі т-вам краязнаўства пры БДУ. Адначасна ЦЖ павінна праз часопіс «Наш Край» зьмяшчэньнем адпаведных матар'ялаў паказаць кіраўніцтва самадукавым па краязнаўству, а таксама заснаваць у часопісі адзел кансультацыі, выказаў краязнаўцам на розныя запытаньні і ліставаньня краязнаўцаў паміж сабой аб абмене матар'яламі і г. д. Перад Галоўнаукай трэба ўзняць пытаньне аб каротка-тэрміновым і доўгатэрміновым прыкамандраваньні мясцовых краязнаўцаў да навуковых устаноў для павышэньня свае кваліфікацыі.

Аб зьбіраньні народных тэрміналёгічных матар'ялаў.

(ДАКЛАД Я. ЛЁСІКА).

Апавяшчэньне зьезд з гісторыяй беларускай тэрміналёгічнай работы, з яе прынцыпамі і метадамі і з тым, што ўжо зроблена ў гэтай часьці навукова-дасьледчай працы Беларускай Акадэміі Навук, закладчык перайшоў да вывучэньня важнасьці для справы культурнага будаўніцтва кожнага запасу тэрміналёгічнай работы. Чалавек без належнага запасу слоў для выражэньня культурных паняцьцяў можа быць толькі „напоў-асьвечаным" чалавекам. Таксама і народ без свае навуковае тэрміналёгіі ня можа стварыць вялікіх культурных цэннасьцяй. Навуковая тэрміналёгія ў іншых краінах пароллі вытваралася стагодзьдзямі; ад нас гісторыя патрабуе выпрацаваць яе ў ударным парадку. Вось чаму і камуністычная партыя і савецкая ўлада адразу-ж зьвярнула належную ўвагу на гэту важную і адказную справу. Даць дакладную тэрміналёгію для таго ці іншае навукі, якая-б у поўнай мерэ адпавядала навуковасьці і адначальна-б пазагачна ю і штодзённую практыку,—справа ня лёгкая, і Інстытут Навуковае Мовы Беларускай Акадэміі Навук лічыць, што ўдасканаліць сваю работу зможа ён толькі ў тым выпадку, калі на помач яму прыдзе актыўная работа ўсіх зацікаўленых асоб і ўстаноў. Сказаючыся знайсьці вялікае слоўнае багацьце ў жывой народнай мове, Інстытут Навуковай мовы думае ў першую чаргу мець падтрыманьне ў сваей рабоце—у мясцовых краязнаўчых арганізацыях і таварыствах. Краязнаўчыя та-арыствы і гурткі, а таксама іншыя навукова-дасьледчыя і навучальна-асьветныя ўстановы і арганізацыі на мясцох могуць дапамагчы тэрміналёгічнай справе, зьбіраючы народную тэрміналёгію.

Пры запісах найлепш трымацца мясцовага вымаўленьня, каб, пераводзячы на літаратурны правапіс, не пасягаць часам корана слова і яго значэньня.

За разьвіцьцё хіміі і хімічнай прамысловасьці.

Пытаньне аб хімізацыі нашай краіны паўстала ў сучасны момант, як баявое пытаньне дню. Індустрыялізацыя краіны і прасоўваньне наперад па шляху нашага сацыялістычнага будаўніцтва магчыма толькі пры ўмове арганізацыі нашай прамысловасьці на шырокай навуковай базе і пры сьвядомым калектыўным удзеле працоўных мас усяго нашага Саюзу. Разьвіцьцё ўсёй нашай прамысловасьці ў поўнай ступені шчыльна зьвязана, часта нават абумоўлена разьвіцьцём хімічнай галіны прамысловасьці.

Вось чаму садзейнічаньне разьвіцьцю хімічнай прамысловасьці, а разам з ёю і хімізацыя насельніцтва нашага Саюзу, у прыватнасьці БССР, зьяўляецца задачай вялікай важнасьці.

15-га сьнежня мінулага году пры Цэнтральным Савеце ТДА-Авіяхіму БССР была арганізавана **хіміка-навукова-прамысловая сэкцыя.** Задачай сэкцыі зьяўляецца, галоўным чынам: садзейнічаньне і ўзмацненьне разьвіцця хімічнай прамысловасьці БССР; хімізацыя іншых галін прамысловасьці; шырокая прапаганда хіміі сярод усяго насельніцтва і хімізацыя школ.

У сэкцыі ўдзельнічаюць усе выдатныя навуковыя працаўнікі і інжынэры БССР. На сваіх пленарных пасяджэньнях сэкцыя абрала прэзыдыум на чале з праф. Прылежаевым, інжынэрам Позьнякам, тав. Гімальфарбам і інш. Сэкцыя праводзіць сваю працу праз камісію.

Былі ўтвораны камісіі па масавай прапагандзе, камісія вытворча-тэхнічная, камісія па абсьледваньню выкладаньня хіміі ў школах гор. Менску і інш. Усе камісіі ўжо разгарнулі сваю працу, напрыклад, па вытворча тэхнічнай камісіі было намечана для абсьледваньня і вывучэньня цэлага шэрагу галін хімічнай прамысловасьці Беларусі, намечан цэлы шэраг дакладаў навукова-тэхнічнага характару. Гэтымі днямі адбудзецца першы даклад праф. Прылежаева на тэму: «Посьпехі сучаснай хіміі», а таксама вядомага спэцыяліста па бражэньню асыстэнта берлінскага дзяржаўнага універсытэту Блюмэльфэльда, праф. Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі, інжынэра-хіміка ВСНГБ і інш.

Камісія па абсьледваньню выкладаньня хіміі распачне гэтымі днямі неспасрэднае абсьледваньне ўсіх тыпаў школ гор. Менску, для чаго выпрацавана падрабязная анкета абсьледваньня.

Разгортвае сваю працу камісія па масавай прапагандзе. Апошняя сваю працу будзе пагоджваць, галоўным чынам, з працай культадзелу ЦСПСБ, рабочых клюбаў і інш.

Трэба адзначыць, што за кароткі час свайго існаваньня сэкцыя пасьпела аб'яднаць вакол сябе ўсіх амаль вучоных, інжынэраў, выкладчыкаў і іншых хімікаў гор. Менску. Зацікаўленасьць да працы вялікая. Трэба спадзявацца, што разгорнутая праца навуковай хімічна-прамысловай сэкцыі будзе адыгрываць вызначаную, не апошнюю ролю ў справе хімізацыі, а таксама і індустрыялізацыі нашай краіны.

Трэба толькі, каб усе дзяржаўныя органы, грамадзкія арганізацыі, а таксама пасобныя працоўныя зацікавіліся яе працай і дапамаглі ў гэтай важнай справе.

С. Гіммельфарб.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб адкліканьні члена Вярхоўнага Суду БССР тав. Віленстовіча, Паўла Грыгоравіча, са складу Вярхоўнага Суду БССР і аб назначэньні тав. Конанава, Гаўрылы Фёдаравіча членам Вярхоўнага Суду БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Адкліканьні члена Вярхоўнага Суду БССР т. Віленстовіча, Паўла Грыгоравіча са складу Вярхоўнага Суду БССР.

2. Назначыць тав. Конанава, Гаўрылу Фёдаравіча членам Вярхоўнага Суду БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

22 сьнежня 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

об отзыве члена Верховного Суда БССР тов. Виленстовича, Павла Григорьевича, с состава Верховного Суда БССР и о назначении тов. Кононова, Гавриила Федоровича членом Верховного Суда БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

1. Отозвать члена Верховного Суда БССР тов. Виленстовича, Павла Григорьевича из состава Верховного Суда БССР.

2. Назначить тов. Кононова, Гавриила Федоровича членом Верховного Суда БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

22 декабря 1928 г.
г. Минск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб ослабаненьні тав. Адамайціса, Язэпа Адамавіча ад абавязкаў Народнага Камісара Гандлю БССР і аб назначэньні тав. Аксючыца, Нічыпара Лукашова, Народным Камісарам Гандлю БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. У зьвязку з пераходам тав. Адамайціса, Язэпа Адамавіча на сталую работу ў г. Маскву, ослабаніць яго ад абавязкаў Народнага Камісара Гандлю БССР.

2. Назначыць тав. Аксючыца, Нічыпара Лукашова Народным Камісарам Гандлю БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

22 сьнежня 1928 году,
г. Менск.

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета БССР

об освобождении тов. Адамайтиса, Иосифа Адамовича от обязанностей Народного Комиссара Торговли БССР и о назначении тов Аксючица, Никифора Лукашевича Народным Комиссаром Торговли БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

1. В связи с переходом тов. Адамайтиса, Иосифа Адамовича на постоянную работу в Москву, освободить его от обязанностей Народного Комиссара Торговли БССР.

2. Назначить тов. Аксючица, Никифора Лукашевича, Народным Комиссаром Торговли БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

22 декабря 1928 г.
г. Минск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

пра склад Галоўнага Выставачнага Камітэту 1-ай Усебеларускай Выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Зацьвердзіць наступны склад Галоўнага Выставачнага Камітэту 1-ай Усебеларускай Выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці БССР:

1) Галадзед, М. М.—Старшыня Галоўнага Выставачнага Камітэту; 2) Прышчэпаў, З. Х.—Намесьнік Старшыні Галоўнага Выставачнага Камітэту; 3) Кара, С. Б.—Намесьнік Старшыні Галоўнага Выставачнага Камітэту; 4) Масюкоў—ад НК Земляробства; 5) Лавоўскі—ад НК РСІ; 6) Сафаровіч—ад Бюро інж.-тэхн. сіл; 7) Брыскін—ад Бел. саюзу сам.-прам. кап.; 8) Вайтовіч—ад ЦСПСБ; 9) Яцкевіч—ад Менскага АВК; 10) Некрашэвіч—ад НК Асьветы; 11) Гарэшка—ад Навук.-Дасьл. Інст. Імя Леніна; 12) Бойка—ад Навук.-Дасьл. Інстытуту імя Леніна; 13) Цітаў—ад ЦСУ; 14) Ліхановіч ад НК Гандлю; 15) праф. Пічэта—ад Бел. Дзярж. Універсытэту; 16) Сокоў—ад ЦП Саюзу Сельгаспрацоўных; 17) Лабкін—ад Акадэміі Навук; 18) Талаш—ад Бел. Саюзу с.-г. кааператыў; 19) Дубіна—ад Беларускага С.-Г. Банку; 20) Галавач ад ЦК ЛКСМ; 21) Платуп—ад ЦП Саюзу прац. асьветы; 22) Каплан—ад Дзярж. Плян. Камісіі; 23) Бонч-Асмалоўскі—ад Дзярж. Плян. Камісіі; 24) Сеніч—ад Беларускай С.-Г. Акадэміі; 25) Стракоўскі—ад ВСНГ; 26) Фіш—ад ВСНГ; 27) Наўлінскі—ад Бел. Аб'яднаньня кап. саюзаў; 28) Ульянаў—ад Упаўнаваж. НК Зам. Сураў пры СНК БССР; 29) Мяркулаў—ад НК Праны; 30) праф. Скандракоў; 31) праф. Аляксеў; 32) праф. Ключароў; 33) праф. Пеліхаў; 34) навук. прац. Журык; 35) праф. Рэнарх; 36) праф. Дубах; 37) Кугель—рабочы фабрыкі абутку ў Менску; 38) Грынкевіч—рабочы «Эльводу»; 39) Пятроўскі—селянін камуны «Сейбіт»; 40) Хмілеўскі, Ягор Захаравіч—селянін вёскі Астравы, Самахвал. раёну. Мен. округі; 41) Міхетка, Капітон Янкавіч—селянін мяст. Заслаўя, Мен. округі.

II. Назначыць тав. Дубіну, Антова Васільевіча дырэктарам 1-й Усебеларускай Выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці БССР.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў І Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

22 сьнежня 1928 г.
г. Менск.

ХРОНІКА.

21—22 студзеня нерабочыя дні.

Як паведамілі начатга супрацоўніка ў Наркампрацы БССР. 21 і 22 студзеня зьяўляюцца нерабочымі днямі. 21 студзеня будзе сьвяткавацца замест дня сьвята каляд 26 сьнежня, якое адпрацавана рабочымі і служачымі.

Самастрахаваньне сялянак.

ЦК камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі супольна з Наркамсацыяльнай забясьпекі зараз распрацоўваюць палажэньне аб касах самастрахаваньня сялянак на выпадак цяжарнасьці. Паводле праэкту гэтага палажэньня, дапамогу будуць атрымліваць усе сялянкі, не пазбаўленыя выбарчых правоў. На дагляд і харчаваньне дзіцяці і на розныя інш. выдаткі мяркуецца дапамога ў 30 руб.

Гэта палажэньне ў хуткім часе ўносіцца на зацьверджаньне СНК.

За нядбайныя адносіны да працы — да адказнасьці.

За нядбайныя адносіны да працы праўленьне Менсельпрэдсаюзу пастанавіла:

Праўленьню Менскага с.-г. крэдытнага таварыства за няпрыняцьце належных мер к спагнаньню пратэрмінаваных пазык і закантрактаваных культур—абвясьціць вымову.

За несваечасовае прадстаўленьне розных зьвестак Менсельпрэдсаюзу, рахункаводам: Чэрвенскага, Лагойскага, Зьмітраўскага і Старасельскага с.-г. крэд. т-ваў абвясьціць вымову з папярэджаньнем аб зьняцьці з працы, як асабіста адказнымі за несваечасовае прадстаўленьне зьвестак.

Да пабудовы Дому Ўраду.

У сучасны момант вядзецца гэрміновая праца па складаньню ўмоў конкурсу на лепшы праект на пабудову Дому Ўраду ў Менску.

Намячаецца ў пачатку лютага абвясьціць Усесаюзны конкурс на лепшы праект. Апрача гэтага камісія зараз падшукае архітэктара для вядзеньня тэхнічнай працы па падрыхтоўцы да будаўніцтва.

Перавыбарчая кампанія рабочай кааперацыі БССР.

Улічваючы важнасьць справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, якая зараз праводзіцца па БССР, прэзыдыум Белрабсакуму пастанавіў правесьці перавыбарчую кампанію рабочай кааперацыі БССР з 15 лютага да 15 красавіка.

Арганізацыя часовай кантрольнай камісіі.

Цэнтральнае праўленьне саюзу сувязі вырашыла арганізаваць часовую кантрольную камісію пры рабочкоме Менскай пашт.-тэлеграфнай канторы. Аб'ектам працы камісіі вызначаны плян пабудовы аўтаматычнай тэлефоннай станцыі і матэрыяльнае ўзмачнаваньне пабудовы дому сувязі.

Падрыхтоўка да пасеўнай кампаніі.

Па Менскай акрузе будзе працаваць 370 машын па ачыстцы насеньня. Утворана спэцыяльныя абозы з с.-гасп. машын па ачыстцы, гэтыя абозы будуць перыяжджаць з вёскі ў вёску. У час пасеўнай кампаніі будзе заложана 352 паказальныя вучасткі на розныя тэмы. Усе калгасы Менчыны за час кампаніі будуць пераведзены на шматпольле. Апрача таго на шматпольле будзе пераведзена 21750 гэкт. у сялянскіх гаспадарках.

Выезд прафпрацаўнікоў на перавыбары сельсаветаў.

Згодна пастановы цэнтральнага праўленьня саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, выязджаюць усе сябры прэзыдыуму ЦП саюзу ў акругі БССР для правядзеньня перавыбараў сельсаветаў.

Батракі—на адказную працу.

За мінулы год вылучаны на адказную гаспадарчую і саюзную працу 102 батракі.

Вылучэньні вербаваліся з нізавога прафактыву.

Знаходзяцца вылучэньні з батрацкай моладзі.

НАВУКА І ТЭХНІКА.

43 дні бяз стравы.

Грамадзянін Шчогалеў запрапанаваў прафэсару маскоўскага Інстытуту фізіёлёгіі харчаваньня Шатэрнікаву зрабіць над ім, Шчогалевым, вопыты доўгай галадоўкі пад наглядам урачоў Сазё жаданьне Шчогалеў матываваў тым, што вопыты доўгага галаданьня, якія ён рабіў раней, ані не падрывалі яго арганізму.

Праф. Шатэрнікаў згадзіўся на прапанову Шчогалева і пачаў пераводзіць яго на поўную галадоўку наступова. Галадоўка пягнулася ў працэсу 43 дзён, прычым за ўвесь гэты час галадоўчы атрымліваў толькі ваду—да 5 шклянак у дзень. За ўвесь гэты час Шчогалеў адчуваў сябе бадзёра, прадаваў, шмат гуляў, хадзіў.

За час голаду Шчогалеў палягчаў на 14 кілёграмаў. Ён хацеў працягнуць галадоўку да 60 дзён, але для навуковага дасьледу хапіла 43, і таму яго ўгаварылі прыняць страву. Зараз ён хутка паправіцца, набываючы ў вазе па кілё ў дзень.

Навуковыя дасьледваньні і нагляды за галадаючым далі шэраг каштоўных для навукі матар'ялаў.

Скарыстаньне акіянскіх хваляў.

Лейтэнант ваўн.-амэрыканскага флёту Лібрана Сьміт вадумаў цікавую сыстэму гідраўлічных насосаў, дзеля скарыстаньня акіянскіх хваляў як рухаючай сілы.

Хвалі ідуць у агрэмадныя трубы, пастаўленыя насустрач прыбою, і сваей сілай падымаюць ваду на трубах на круты бераг, на якім знаходзяцца вадзёмы. З гэтых вадзёмаў вада пападае ў рэзэрвуар, накапляецца там, затым цячэ ўніз па другіх трубах і сваей сілай рухае генэратары сілавых установак.

Электра-трактар з аэрастатам.

Адной з вялікіх перашкодаў электрыфікацыі ворыва зьяўляецца неабходнасьць апучэньня плуга з матораам доўгім кабелем, які ў часе ўсашкі пяшчэцца за плугам або трактарам на зямлі. Кабель ня толькі гармозіць працу, але і сам значна сьціраецца аб зямлю.

У Італіі надумалі спосаб, які дае такую вялікую перавагу і значна паскарае працу, даводзячы хуткасьць працы трактара да 4 км. у гадзіну, пры глыбіні баразны ў 30—40 см. Кабель падвешваецца да невялікага аэрастата (паветраны шар), які лёгка падтрымлівае кабель на поўнай вышчыні. Кабель такім чынам ані ня шкодзіць працы трактара.

Новы порах.

Капітан амэрыканскай арміі Цыммэр надумаў спосаб здабываць новы ўзрыўчаты матар'ял «Радый-атоміт», які зьяўляецца вынікам яго 25-гадовай працы над радыем. Асноваю гэтага „новага пораху"—вуглярод.

Выпрабаваньні радый-атоміту ў амэрыканскіх вінтоўках паказалі значнае павялічэньне пробіўной сілы кулі ў параўнаньні з цяперашнім порахам. Пры ўзрыве новага пораху дае мала дымлю, не мяняе формаў кулі, гук ад стрэлу таксама значна цішэйшы.

Працэс выробу гэтага пораху зусім бясьпечны, бо да канчатковага выробу ён ня можа ўзарвацца.

Радый-атоміт ня ўзрываецца ад удару або трэньня. Руйнуючая сіла яго ўзрыву дасягае разоў большая за энэргію дынаміту.

Апавяшчэньні.

**ДА ЎСІХ АКРУГКОМАЎ, РАЙКОМАЎ І ЯЧЭЕК КП(б)Б І ЛКСМ, ЮБІЛЕЙНЫХ КАМІСІЙ ПА СЬВЯТКАВАНЬНЮ ДЗЕ